WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЛІСТАПАДА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 229
(26837)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ СВЯТА ВЫКОНВАЦЬ СВАЕ ФУНКЦЫІ ПА АБАРОНЕ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

**Расія павінна дапамагаць Беларусі ў забеспячэнні бяспекі і абараназдольнасці Саюзнай дзяржавы. Аб гэтым заявіў 22 лістапада Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы даклад па Плану прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл) Беларусі і Расіі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яшчэ 10 гадоў таму на Вышэйшым дзяржсавеце Саюзнай дзяржавы было прынята рашэнне аб стварэнні сумеснай расійска-беларускай групоўкі войскаў, зонай адказнасці якой у Саюзнай дзяржаве і АДКБ з'яўляецца забеспячэнне бяспекі на заходнім напрамку. За гэтыя гады адбыліся пэўныя змяненні, «у тым ліку і тых сіл, якія знаходзяцца супраць беларуска-расійскай групоўкі войскаў». «Зразумела, час ідзе, нешта змяняецца, дзесьці кардынальна, дзесьці менш. Таму нам неабходна сёння разгледзець прымяненне РГВ(с)». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. «Таму першае, што я хачу сказаць: мы, вядома, будзем свята выконваць свае функцыі па абароне, я лічыў і да гэтага часу лічу, нашай агульнай Айчыны, — сказаў ён. — Няма чужой для нас Беларусі — гэта наша краіна, дзе мы жывём, дзе будуць жыць нашы дзеці, і няма чужой Расіі. З Расіяй мы заўсёды былі і будзем разам, якія б катаклізмы ні адбываліся».

«Мы, зразумела, будзем выконваць свае функцыі, але мы іх можам выконваць толькі пры падтрымцы Расіі, ну хаця б узбраеннем, — адзначыў беларускі лідар. — Гэта не падыход, калі нам часам прапануюць купляць узбраенне за свой кошт, ды яшчэ па рыначнай, як яны ўмеюць гаварыць, цане. Зразумела, што тут, на гэтым напрамку Расія зацікаўлена, каб беларуская армія была ў парадку». «Таму трэба дапамагаць. Я гэта гавару публічна, і я гэтага не баюся, магу паўтарыць дзе хочаце». Аляксандр Лукашэнка таксама заўважыў, што сур'ёзнае рашэнне аб прымяненні РГВ(с) павінна прымацца на ўзроўні ВДС. «Ніякія дакументы ў рабочым парадку я падпісваць не буду. Ёсць ВДС, вось ён збярэцца — мы разгледзім гэты план. А сёння вы павінны мне далажыць. Я ведаю, што мой расійскі калега разглядаў гэты план, ён пагадзіўся з ім. Цяпер мы яго разгледзім, а на бліжэйшым пасяджэнні ВДС зацвердзім. Гэта будзе правільна. Утойваць нам тут няма чаго, мы адкрытыя для свету. Думаю, Расія таксама не збіраецца нешта скрываць». Ён падкрэсліў, што Беларусь уносіць вялікі ўклад у справу міру і бяспекі, забяспечваючы не толькі сваю бяспеку, «але і брацкай Расіі, ды і не толькі Расіі». «І гэта для нас пытанне выгаднае, калі хочаце іміджавае. Яшчэ і таму мы нічога скрываць не збіраемся, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — А так нас лічаць увесь час нахлебнікамі. Грамадства павінна ведаць, што мы не нахлебнікі, а выконваем найважнейшую функцыю па абароне, у тым ліку расійскай дзяржавы. Вось у чым праўда».

Як паведаміў журналістам Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Леанід Мальцаў, Прэзідэнт Беларусі ў цэлым адобрыў План прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл) Беларусі і Расіі. «Але Прэзідэнтам як старшынёй Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы прынята рашэнне гэты план, паколькі гэта вельмі важны дакумент, зацвердзіць на пасяджэнні ВДС». «Такое разуменне, што мы зацвердзілі план і на гэтым усё, — гэта няправільна. Бо групоўку трэба забяспечваць узбраеннем, тэхнікай, боепрыпасамі, гаруча-змазачнымі матэрыяламі і гэтак далей, — сказаў Леанід Мальцаў. — Таму размова і вялася аб тым, як забяспечыць справядлівае, разумнае, усебаковае забеспячэнне групоўкі. Ніхто не збіраецца нешта з сябе спіхваць або на кагосьці ўзвальваць».

## ПАСЛУХМЯНАЯ ЦЭГЛА

Мінскія будаўнікі на ўзвядзенні сучаснага аб'екта па-суседству з «Атлантам» на сталічным праспекце Пераможцаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мікалай СНАПКОЎ:

## «У БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ ЁСЦЬ УСЕ НЕАБХОДНЫЯ ЯКАСЦІ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАЙМАЦЦА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВАМ»

**За апошнія пару гадоў словы «лібералізацыя», «бізнэс», «прадпрымальніцтва», «інвестыцыі» сталі ўжывацца ў нашай краіне значна часцей, чым у папярэдні час. І, што самае важнае, пра такія істотныя для эканомікі паняцці пачалі гаварыць не толькі прадстаўнікі дзелавой супольнасці, але і беларускія чыноўнікі — прычым на ўсіх узроўнях улады. Безумоўна, працэсы лібералізацыі беларускай эканомікі немагчымыя без удзелу Міністэрства эканомікі, якому належыць вядучая роля ў фарміраванні эканамічнай палітыкі нашай краіны, таму сёння мы прапануем вашай увазе інтэрв'ю з міністрам эканомікі Рэспублікі Беларусь Мікалаем Снапковым, у якім мы паспрабуем высветліць сучасны стан эканомікі Беларусі, а таксама яе праблемы і задачы на бліжэйшую пяцігодку.**

Фота Валерыя ХАРЧАНКІ.

***— Напэўна, самым чаканым дакументам у 2010 годзе можна назваць Дырэктыву Прэзідэнта № 4, распрацоўка якой ідзе з красавіка гэтага года. Калі ласка, раскажыце, якім, на Вашу думку, павінен быць гэты дакумент і які імпульс ён павінен надаць развіццю прадпрымальніцкай ініцыятывы? У якім стане зараз знаходзіцца праект гэтага дакумента, ці актыўна ўдзельнічаюць дзелавыя колы ў яго распрацоўцы, ці ўсе прапановы бізнэс-супольнасці будуць улічаныя?***

— Сапраўды, сёння працягваецца праца над праектам Дырэктывы аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці. У яго распрацоўцы актыўны ўдзел прымаюць прадстаўнікі Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, ГА «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў», ГА «Беларускі саюз прадпрымальнікаў», СЮА «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва», рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных ураду, Генеральнай пракуратуры, Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага судоў, абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, а таксама эксперты з асобных міжнародных арганізацый. Такім чынам, пры падрыхтоўцы такога важнага дакумента ўлічваюцца інтарэсы бізнэсу, працоўных, спажыўцоў, эканамічнай бяспекі дзяржавы. На сёння дакумент унесены ўрадам у Адміністрацыю Прэзідэнта, дзе праца над ім працягваецца да падпісання кіраўніком дзяржавы.

**«...Як паказвае сусветны вопыт, асноваў для эканамічнай дзейнасці краін з рыначнай сістэмай гаспадарання з'яўляецца малы і сярэдні бізнэс...»**

Мэтай дырэктывы як указа прагрмнага характару з'яўляецца замацаванне ўмоў для раскрыцця прадпрымальніцкага патэнцыялу грамадзян Рэспублікі Беларусь як найбольш важнага фактару ўстойлівага развіцця краіны на сучасным этапе. Істотнае паляпшэнне ўмоў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці прадугледжвае прыняцце як стратэгічных рашэнняў, так і канкрэтных неадкладных мер, якія і ўключаны ў праект дырэктывы.

***— Апошнія пару гадоў у нашай краіне ўзяты курс на лібералізацыю. Скажыце, як Вы ацэньваеце ўжо зробленыя крокі?***

— Праца па лібералізацыі ўмоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці пачалася ў 2008 годзе, калі ў мэтах падтрымкі рэальнага сектара эканомікі і захавання макраэканамічнай стабільнасці ўрадам прымаліся меры па мінімізацыі наступстваў сусветнага фінансавага крызісу. Разам з мерапрыемствамі па захаванні надзейнай працы банкаўскай сістэмы краіны, недапушчэнні падзення ліквіднасці банкаў, захаванні стабільнасці на дэпазітным і валютным рынках, скарачэнні дзяржаўных расходаў і памяншэнні дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту, захаванні патэнцыялу прамысловага комплексу рэспублікі, падтрымцы канкурэнтаздольнасці беларускіх таваравытворцаў, захаванні тэмпаў росту эксперту і рэнтабельнасці рэалізаванай імі прадукцыі былі распрацаваныя дадатковыя меры, накіраваныя на стварэнне спрыяльнага дзелавога і інвестыцыйнага клімату, ліквідацыю залішняга ўмяшання дзяржаўных органаў у дзейнасць суб'ектаў гаспадарання, скасаванне неабгрунтаваных адміністратыўных бар'ераў. У выніку прынятых мераў былі, па-першае, спрошчаны парадак распараджэння дзяржаўнай маёмасцю, працэдура яго адчужэння, механізм уцягвання маёмасці ў гаспадарчы абарот; па-другое, быў зроблены пераход на заяўляльны прынцып дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання; па-трэцяе, комплексна ўрэгуляванае пытанне арэндных адносінаў у рэспубліцы; па-чацвёртае, прыняты шэраг мераў па ўдасканаленні падатковага заканадаўства; па-пятае, скарочана на 36% колькасць адміністратыўных і тэхнічных працэдур ад іх агульнай колькасці; па-шостае, была адменена рэгістрацыя цэн і тарыфаў на новыя тавары, работы і паслугі, скарочаны пералік тавараў і паслуг, у дачыненні да якіх ажыццяўляецца цэнавае рэгуляванне, пашыраны пералік тавараў, па якіх адмененыя абмежаванні па прымяненні гандлёвай і аптовай надбавак; па-сёмае, была спрошчана працэдура пераводу жылых памяшканняў, што знаходзяцца на першых паверхах шматкватэрных жылых дамоў, у нежылыя; па-восьмае, была створана празрыстая і няцяжкая для бізнэсу сістэма кантролю, якая ўлічвае ступень выканання заканадаўства правяраемым суб'ектам, прадугледжаны двухгадовы мараторый на праверкі для нанава зарэгістраваных суб'ектаў гаспадарання; і, нарэшце, быў вызначаны парадак прадастаўлення суб'ектам малога прадпрымальніцтва фінансавых сродкаў на зваротнай або бязвыплатнай аснове, маёмасці на ўмовах фінансавай арэнды (лізінгу), уведзены новыя механізмы падтрымкі — ільготнае крэдытаванне і прадастаўленне гарантый па банкаўскіх крэдытах.

**«...Можна казаць, што наступствы сусветнага фінансавага крызісу пераадольваюцца паспяхова, што эканоміка вярнулася на шлях дынамічнага развіцця...»**

СТАР. 2

Ёсць пытанне

## «ЧАМУ МІЛІЦЫЯ АДМОВІЛАСЯ БАРАНІЦЬ МЯНЕ АД ТЭЛЕФОННЫХ МАХЛЯРОЎ?»

### Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА атрымаў СМС аб выйгрышы 1 мільёна фунтаў стэрлінгаў. А міліцыя не пабачыла тут факта махлярства

**Трэцяга лістапада «Звязда» напісала пра кур'ёзны выпадак. Мінскаму пенсіянеру прыйшла эсэмэска: вы выйгралі 450 тысяч фунтаў стэрлінгаў (каля 715 тысяч долараў)! Шчасліўчыку прапаноўвалася для атрымання выйгрышу патэлефанаваць на нумар, адкуль прыйшло паведамленне, або зайсці на сайт і далей кіравацца інструкцыямі. Дзядуля накруціў тэлефон міліцыі. Але не каб паведаміць пра махлярства, а каб... папрасіць міліцыянераў дапамагчы яму атрымаць выйгрыш! Ці трэба казаць, што ў міліцыі небараку засмуцілі: гэта — выхадкі аферыстаў? Каментуючы тады выпадак, прэс-сакратар мінскай міліцыі Аляксандр Ластоўскі заклікаў грамадзян не весціся на такія прапановы: халявы не бывае.**




Вы будзеце смяяцца, але назаўтра такая смс прыйшла мне. Толькі мне пашчасціла ўдвая больш, чым таму дзеду: я «выйграў» цэлы мільён фунтаў стэрлінгаў. Каб пацвердзіць, што я не супраць такога прыза, я быў павінен выслаць ліст на пазначаны адрас электроннай пошты. Як законапаслухмяны грамадзянін, я неадкладна накруціў «102».

— Міліцыя, слухаем, чым можам дапамагчы?

— Ведаеце, мне тут эсэмэска прыйшла, што я мільён фунтаў выйграў. Я чуў, што гэта махлярства. Разбярыцеся!..

— Чакайце, зараз вышлем вам спецыялістаў!

СТАР. 5

### У ХВОРАЙ ЖАНЧЫНЫ СКРАЛІ ГРОШЫ І АДЗЕННЕ

20 лістапада а 18-ай гадзіне на вуліцы Савецкай у Бабруйску 52-гадовая жанчына, хворая на эпілепсію, страціла прытомнасць у выніку прыступу. За паўгадзіны ў яе скралі боты, капялюш і 253 тысячы рублёў. Яна звярнулася ў міліцыю, дзе распачалі крымінальную справу і цяпер шукаюць нахабных зладзеяў.

**Алена КАЗЛОВА.**

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

**ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ і І ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.**

***Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)***

| *Індэкс* | *месяц* | *І квартал* | *паўгоддзе* |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 | 74400 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 | 69600 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 | 119400 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 | 108000 |

***Заставайцеся з намі!***

## «ПАВЕСІЎ» КРЭДЫТЫ НА АДНАВЯСКОЎЦАЎ

### Фермер атрымаў у банку 147 мільёнаў рублёў, якія «распісаў» на даверлівых знаёмых

**Праўда, перад тым як аформіць крэдыты на людзей, паводле звестак прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Кацярыны Лісоўскай, 40-гадовы ўласнік гаспадаркі запэўніў іх, што грошы банку і працэнты за карыстанне імі будзе выплачваць самастойна. Аднак не разлічыў свае сілы...**

А пачалася гэтая крэдытная гісторыя з таго, што чалавек вырашыў пашырыць сваю гаспадарку за кошт пазыкі, а як лепш гэта зрабіць, яму параілі добрыя людзі.

Напрыклад, уладальнік прыватнай друкарні дапамог фермеру з чыстымі бланкамі даведак аб зарплаце з гатовымі пячаткамі, а іншы памагаты, мінскі таксіст, падказаў афармляць крэдыты не на сябе, а на аднавяскоўцаў. З падобнай просьбай фермер і звярнуўся, у прыватнасці, да знаёмага трактарыста. Той не адмовіўся дапамагчы і аформіў на сваё імя вялікі крэдыт у банку, у якім яму не адмовілі, таму што ў даведцы зарплата ў механізатара аказалася... тры мільёны рублёў. Па аналагічнай схеме грошы ў банку атрымалі яшчэ двое вяскоўцаў.

Непрыемныя нечаканасці здарыліся пасля таго, як у фермера не пайшлі справы: прыбытку не было, а аднавяскоўцы пачалі атрымліваць пісьмовыя паведамленні аб неабходнасці пагашэння запазычанасці па крэдытах і працэнтах па іх. Давялося людзям звяртацца па дапамогу ў праваахоўныя органы, пасля чаго была зроблена праверка фактаў і заведзеная крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Фабрика «Березка» (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже капитального строения одноэтажного кирпичного здания швейного ателье (инв. № 630/С-46781), об. пл. 347 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., г. Молодечно, ул. Дроздовича, д. 3.**

**Начальная цена с НДС – 380 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,1828 га.**

**Задаток в сумме 35 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **23.12.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.12.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

## «Я паставіў перад мамай умову: КАЛІ ПЕРАМАГУ НА «ЕЎРАБАЧАННІ», ЯНА НАРОДЗІЦЬ МНЕ БРАЦІКА!»

**Пераможцам дзіцячага «Еўрабачання-2010» стаў 12-гадовы Уладзімір АРЗУМАНЯН з Арменіі. Яго песня «Мама» набрала 120 балаў, на адзін бал (!) апярэдзіўшы песню «Boys and girls» канкурсантаў з Расіі Лізы ДРОЗД і Сашы ЛАЗІНА. Песня беларуса Данііла КАЗЛОВА — «Музыкі святло»— замкнула пяцёрку лідараў, набраўшы 85 балаў.**

Фота Вольгі ЛАСКІ.

— Я вельмі шчаслівы! — падзяліўся на прэс-канферэнцыі Уладзімір АРЗУМАНЯН. — Арменія першы раз перамагла на гэтым конкурсе, і я вельмі рады. А перамогу я прысніў сёння ноччу: снілася, што будзе цяжкі дзень, але што я перамагу. І маім галоўным талісманам на сцэне быў мой нацельны крыжык. Мая песня пра тое, як я закахаўся і дзялюся гэтым з мамай. Пытаюся ў мамы, што мне рабіць, каб і дзяўчына мяне пакахала.

Цікава тое, што і песня, і сон сталіся вешчымі. На пытанне журналістаў, з кім за час конкурсу хлопчык найбольш пасябраваў, асабліва Уладзімір выдзеліў канкурсантку з Сербіі Соню СКОРЫЧ.

— На конкурсе я закахаўся, — распавёў падлетак. — Гэта Соня з Сербіі, учора я прызнаўся ёй у каханні. Падтрымліваць сувязь мы будзем праз фэйсбук.

Як прызнаўся хлопчык, у яго планах пазначана выданне дыска, дзе ён «будзе спяваць, як і ўсе армяне — пра каханне». А першае, што зробіць Уладзімір па прыездзе дадому — згуляе ў футбол і сходзіць у секцыю каратэ (Уладзімір мае карычневы пояс. — **Аўт.**)

***— Вова, а ці абяцала табе мама што-небудзь у выпадку, калі ты пераможаш?***

— Мама абяцала мне дзіця (*усміхаецца.* — **Аўт.**). Мы дамаўляліся, што калі я перамагу, яна народзіць мне браціка.

— Як і любая маці, я радуюся за сваё дзіця, вельмі ўсхваляваная і вельмі шчаслівая за свайго сына, — расказала расчуленая мама Уладзіміра. — І перамога на дзіцячым «Еўрабачанні» — гэта вялікая перамога для Арменіі.

На пытанне, ці адчувае Уладзімір АРЗУМАНЯН сябе зоркай, хлопчык адказаў: «Зоркі — на нябёсах, я не зорка, я — чалавек».

СТАР. 7

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.11.2010 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 3 026,00 | 1 чэшская крона | 168,43 |
| ▲ 1 еўра | 4 158,93 | 1 польскі злоты | 1058,43 |
| 1 латвійскі лат | 5 860,37 | ▼ 1 расійскі рубель | 97,63 |
| 1 літоўскі літ | 1 204,33 | 1 украінская грыўня | 380,58 |

### Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,9950 |
| 10 UAH | 38,9825 |
| 1000 BYR | 10,2328 |
| EUR | 42,6367 |

Агенцтва Уладзіміра Грыцкова

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НЕКАЛЬКІ ТЫСЯЧ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ ПРАЙШЛІ МАРШАМ ПА КІЕВЕ

**Прадпрымальнікі, якія пратэстуюць супраць новага Падатковага кодэкса, прайшлі маршам ад Майдана Незалежнасці да адміністрацыі прэзідэнта.**

У адміністрацыю прэзідэнта яны перадалі патрабаванне адстаўкі прэм'ер-міністра Мікалая Азарава, віцэ-прэм'ера Сяргея Цігіпка і старшыні Дзяржкампрадпрымальніцтва Міхася Бродскага, якія распрацавалі гэты дакумент. Прэзідэнта Віктара Януковіча яны папрасілі накласці вета на Падатковы кодэкс. У шэсці прынялі ўдзел некалькі тысяч чалавек. Прадпрымальнікі з крыкамі «Ганьба!» прамаршыравалі па Інстытуцкай вуліцы. У выніку рух аўтатранспарту быў паралізаваны. Пры гэтым, як паведамляе агенцтва, на ўездзе ў горад спынілі 140 аўтобусаў з прадпрымальнікамі, якія планавалі прыняць удзел у акцыі пратэсту на Майдане. Новы Падатковы кодэкс быў прыняты Вярхоўнай Радай у другім чытанні 18 лістапада. Дакумент скарачае пералік відаў дзейнасці малога і сярэдняга бізнэсу, якія абкладаюцца адзіным падаткам.

### КУПАЛ БУДЫНКА РЭЙХСТАГА ЗАКРЫТЫ ДЛЯ НАВЕДВАННЯ: У БЕРЛІНЕ ШУКАЮЦЬ ДВУХ БАМБІСТАЎ

**У цэнтры Берліна вакол гістарычнага будынка рэйхстага, дзе праходзяць пасяджэнні бундэстага (парламента), узмоцненыя меры бяспекі. З панядзелка закрыты доступ турыстаў на яго купал і на тэрасу на даху будынка.**

Як паведаміў сенатар па ўнутраных справах Берліна Эрхард Кертынг, бар'ерамі і паліцэйскімі аўтамабілямі перакрытыя вуліцы побач з будынкам, знешнюю яго ахову нясуць 60 паліцэйскіх. Такія меры, паводле інфармацыі штотыднёвіка Der Spiegel, прыняты ў сувязі з інфармацыяй пра «магчымы тэрарыстычны напад на рэйхстаг з захопам заложнікаў» — па аналогіі з тым, што быў прадпрыняты ў індыйскім горадзе Мумбаі ў 2008 годзе.

Цяпер улады адшукваюць двух бамбістаў, праглядаючы звесткі пра візы, выдадзеныя замежным грамадзянам, і пра асоб, якія прыбылі ў Нямеччыну з краін Блізкага Усходу і Паўднёва-ўсходняй Азіі, паведамляе Fox News. Спецслужбы мяркуюць, што гэтыя бамбісты-самазабойцы прыбылі ў Берлін прыкладна паўтара месяца назад з пакістанскага рэгіёну Вазірыстан. Вядома, што ў гэты ж час яшчэ адна група тэрарыстаў збіраецца адправіцца ў Нямеччыну на працягу найбліжэйшых тыдняў, каб арганізаваць напад з выкарыстаннем стралковай зброі на адзін ці некалькі мегаполісаў.

### АРМЯНСКІМ САЛДАТАМ ДАЗВОЛІЛІ КАРЫСТАЦЦА СОТАВЫМІ

**Міністэрства абароны Арменіі дазволіла вайскоўцам тэрміновай службы карыстацца мабільнымі тэлефонамі на тэрыторыі вайсковых частак. Адпаведны загад з мэтай спрашчэння сувязі паміж вайскоўцамі і іх сваякамі падпісаў міністр абароны краіны.**

Згодна з загадам, салдаты змогуць карыстацца мабільнымі тэлефонамі ў строга вызначаныя гадзіны. Раней, паводле статуту, вайскоўцам наогул забаранялася карыстацца мабільным тэлефонам на тэрыторыі ваеннай часці. Акрамя таго, паміж міністэрствам абароны Арменіі і тэлекамунікацыйнай кампаніяй VivaCell MTS падпісана дамова, у рамках якой выходныя званкі вайскоўцаў будуць бясплатнымі, а аплачваць гутарку будзе бок, які прымае званок.

### БРЫТАНЦЫ ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ НА ТРОНЕ ПРЫНЦА УІЛЬЯМА

**Большасць брытанцаў аддалі б перавагу таму, каб каралеўскі прыстол успадкаваў старэйшы ўнук Лізаветы II — Уільям, а не яе сын Чарльз. Такое меркаванне апытаваных апытальнікаў вынікі двух апытанняў, праведзеных па замове брытанскіх газет. У першым выпадку за тое, каб наступным каралём Вялікабрытаніі стаў прынц Уільям, выказаліся 64% апытаных, супраць — 20%, а ў другім — 44% і 37% адпаведна, перадае Бі-бі-сі.**

Папулярнасць прынца Уільяма цяпер значна вырасла ў сувязі з аб'явай пра яго хуткае вяселле з Кейт Мідлтан. Цікава, што надоечы першы ў чарзе на брытанскі трон прынц Чарльз упершыню не выключыў, што яго жонка Каміла Паркер-Боулз зможа стаць каралевай Вялікабрытаніі пасля таго, як ён узыдзе на трон. На працягу ўсіх 5 гадоў пасля іх вяселля каралеўская сям'я настойвала на тым, што Каміла можа быць толькі прынцэсай-кансорт — гэта значыць жонкай каранаванай асобы, якая не мае права быць каралевай.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**ИНФОРМИРУЕТ**

В извещении о проведении 30 ноября 2010 г. 105-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 19 ноября 2010 г.) в абзаце восьмом вместо слов «Задаток должен быть внесен до 15.00 28.10.2010;» **читать «Задаток должен быть внесен до 15.00 28.11.2010;».**

**Телефон для справок 227 40 22.**

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже зданий:**

**Лот № 1**: торговый центр, расположенный по адресу: **Минская область, Пуховичский район, г.п. Руденск, ул. Советская, 15.**

Начальная цена с НДС – **167 724 013** бел. руб.

**Лот № 2**: магазин «Хозтовары», расположенный по адресу: **Минская обл., Пуховичский р-н, п. Правдинский, ул. Зеленая, 16а.**

Начальная цена с НДС – **10 315 518** бел. руб.

**Лот № 3**: магазин «Товары повседневного спроса», расположенный по адресу: **Минская обл., Пуховичский р-н, д. Выемка.**

Начальная цена с НДС – **7 132 146** бел. руб.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.01.2010.

Аукцион состоится **30.11.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.11.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

ISSN 1990 - 763X

# БЕЛАРУСЬ ПЛАНУЕ ФІНАНСАВАННЕ ЎЗБРАЕННЯ АРМІІ З УЛІКАМ МІЖНАРОДНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ І СІТУАЦЫІ Ў КРАІНЕ

**Пытанні далейшага развіцця Узброеных Сіл разглядаліся 22 лістапада на нарадзе ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У прыватнасці, у цэнтры ўвагі былі пытанні фінансавання другога этапа (2011-2015 гады) Дзяржаўнай праграмы ўзбраення на 2006-2015 гады, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «У свой час мы планавалі аб'ём фінансавання закупак узбраення, зыходзячы з таго, якую будзем мець армію. Хоць часу прайшло няшмат, але фінансава-эканамічны крызіс, зразумела, адбіўся на нашай эканоміцы».

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка не выключыў магчымасці карэкціроўкі аб'ёмаў фінансавання праграмы ўзбраення. «Скажу шчыра: ваенныя займаюць цвёрдую, непрымірымую пазіцыю, а ўрад эканамічна абгрунтуе сваю пазіцыю. Але да адзінай думкі яны не прыйшлі, і цяпер патрэбна прыняцце пэўнага рашэння», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт прапанаваў прыняць рашэнне, зыходзячы з існуючых рэалій. «Калі ў нас ёсць самая малая магчымасць выканаць той вялікі план фінансавання дзяржаўных ваенных праграм, то мы яго павінны выконваць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Калі ў нас сёння нешта не складваецца, то мы аб гэтым павінны канкрэтна і сумленна гаварыць, прызнаючы гэта, і зыходзіць з таго, што ў нас ёсць у наяўнасці».

Пры абмеркаванні гэтай тэматыкі Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць уліку міжнародных абавязацельстваў Беларусі па забеспячэнні бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы з Расіяй. У прыватнасці, на праведзенай напярэдадні нарадзе па Плану прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі «была разгледжана зона адказнасці беларускай арміі ў Саюзнай дзяржаве».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «У Расіі сёння на заходнім напрамку практычна нічога няма, і Расія разлічвае на беларускія Узброеныя Сілы. Яна мае права на гэта разлічваць, якія ні былі б у нас з імі палітычныя нелады, я лічу, што гэта пройдзе. І мы ўсё ж павінны свае функцыі выконваць». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка сказаў, што зыходзячы з міжнародных абавязацельстваў, мы і павінны планаваць узбраенне для беларускай арміі.

Дзяржсакратар Савета Бяспекі Леанід Мальцаў па выніках нарады адзначыў, што прынята рашэнне па фінансаванні найбольш перспектыўных напрамкаў дзяржпраграмы ўзбраення, якія даюць максімальны вынік.

«Працуе формула «кошт — эфектыўнасць». Пытанне не ў тым, большыя або меншыя аб'ёмы фінансавання. Трэба фінансаванне роўна столькі, колькі патрабуе абстаноўка і колькі ёсць магчымасцяў, — падкрэсліў Леанід Мальцаў. — Акрамя ўзбраення і тэхнікі, ёсць яшчэ зарплата, будаўніцтва жылля. Таму ацэньваюцца ўсе гэтыя фактары».

Такім чынам, прынята аптымальнае рашэнне па фінансаванні Дзяржаўнай праграмы ўзбраення на 2011-2015 гады з улікам абстаноўкі, якая складваецца ў краіне.

# У Беларусі ўводзяцца абмежаванні па размяшчэнні ігральных устаноў і павышаецца працэнт выйгрышу ігравых аўтаматаў

**У Беларусі прыняты шэраг мер па павышэнні празрыстасці дзейнасці ігральных устаноў і ўзмацненні патрабаванняў да ігравога абсталявання, якое яны выкарыстоўваюць. Адпаведны ўказ № 599 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні парадку ажыццяўлення дзейнасці ў сферы ігральнага бізнэсу» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 19 лістапада, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Як растлумачылі ў прэс-службе, дакумент накіраваны на далейшае ўдасканаленне заканадаўства, якое рэгулюе ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнэсу. Указам устаноўлена, што з 1 студзеня 2011 года дзейнасць у сферы ігральнага бізнэсу ажыццяўляюць выключна юрыдычныя асобы Беларусі. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнэсу, абавязаны да 1 сакавіка 2011 года здаць у ліцэнзуючы орган арыгінал такога дазволу (ліцэнзіі), яго дублікат і копіі, завераныя ліцэнзуючым органам. На Міністэрства па падатках і зборах ускладзены функцыі па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы ігральнага бізнэсу, а таксама каардынацыі дзейнасці рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у гэтай сферы.

Указам удакладнены абмежаванні па размяшчэнні ігральных устаноў. Для размяшчэння залаў ігравых аўтаматаў змогуць выкарыстоўвацца памяшканні, агульная плошча якіх, уключаючы службовую зону ігральнай установы, павінна быць не меншая за 100 кв.м, а для размяшчэння казіно — не менш як 250 кв.м. Аднак такое абмежаванне не распаўсюджваецца на ігральныя ўстановы, размешчаныя ў гасцініцах і гасцінічных комплексах катэгорыі «тры зоркі» і вышэй. Акрамя таго, ігральныя ўстановы не змогуць размяшчацца ў капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), у якіх размешчаны ўстановы адукацыі, дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя, рэлігійныя арганізацыі; у будынках жылых дамоў, памяшканнях дзяржаўных органаў, банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, аб'ектаў паштовай сувязі і электрасувязі, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый і арганізацый культуры; у фізкультурна-спартыўных збудаваннях (акрамя букмекерскіх кантор і таталізатараў). Пры гэтым ігральныя ўстановы павінны размяшчацца толькі ў капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), займаць гэтыя пабудовы цалкам або іх ізаляваныя памяшканні.

Для ігральных устаноў, размешчаных на 1 студзеня 2011 года ў месцах, якія не адпавядаюць названым патрабаванням, устаноўлены пераходны перыяд. Ім дадзена права ажыццяўляць сваю дзейнасць да заканчэння тэрміну дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) без права яго прадаўжэння, але не пазней за 1 ліпеня 2012 года.

З 1 красавіка 2011 года прадугледжана вядзенне Дзяржаўнага рэестра мадэляў ігравых аўтаматаў, дапушчаных да выкарыстання ў Беларусі. Закладзены сярэдні працэнт грашовага выйгрышу ігравых аўтаматаў пры іх уключэнні ў Дзяржаўны рэестр і далейшым выкарыстанні павінен быць не ніжэйшы за 90 працэнтаў для кожнага ігравога аўтамата.

З 1 ліпеня 2012 года ўводзіцца ў эксплуатацыю спецыяльная камп'ютарная касавая сістэма, якая дасць магчымасць у рэжыме рэальнага часу поўнасцю кантраляваць фінансавыя патокі ігральных устаноў, а таксама рэалізаваць праграму «'абароны іграка», абмежаваўшы доступ да азартных гульняў няпоўнагадовых і іншых катэгорый грамадзян, вызначаных заканадаўствам. Акрамя таго, удакладнены правы арганізатараў азартных гульняў. Ім дадзена права забараняць доступ у ігральную ўстанову наведнікаў у выпадках неаднаразовага парушэння правіл наведвання ігральных устаноў або выкарыстання тэхнічных устройстваў, якія аказваюць уздзеянне на выпадковы вынік азартных гульняў. Арганізатарам азартных гульняў забаронена таксама прымаць на работу ў ігральныя ўстановы асоб, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту.

Указ спыняе практыку ўстанаўлення ставак падатку на ігральны бізнэс у еўра. З 1 студзеня 2011 года яны ўстанаўліваюцца ў беларускіх рублях без дыферэнцыяцыі ў залежнасці ад месца размяшчэння аб'ектаў падаткаабкладання і колькасці ігравога абсталявання.

# «У БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ ЁСЦЬ УСЕ НЕАБХОДНЫЯ ЯКАСЦІ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАЙМАЦЦА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВАМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Урадам краіны таксама падрыхтаваны шэраг дакументаў, накіраваных на далейшае паляпшэнне ўмоў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, на стварэнне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату. У тым ліку гэта праекты адзінага пераліку (рэестру) адміністратыўных працэдур, Плана мерапрыемстваў на 2010-2011 гады па паляпшэнню ўмоў вядзення бізнэсу, плана прыватызацыі на 2011-2013 гады. Зараз таксама распрацоўваецца праект закона аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Ён замацуе пазіцыю дзяржавы наконт неабходнасці і прыярытэтнасці развіцця ўзаемавыгадных адносінаў з прыватным сектарам.

***— Якой Вы бачыце ролю прадпрымальніцтва ў развіцці эканомікі і, у прыватнасці, — ролю малога і сярэдняга бізнэсу?***

— Як паказвае сусветны вопыт, асновай для эканамічнай дзейнасці краін з рыначнай сістэмай гаспадарання з'яўляецца малы і сярэдні бізнэс як найбольш масавая, дынамічная і гнуткая форма дзелавога жыцця. Менавіта ў сектары малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ствараецца і «цыркулюе» асноўная маса нацыянальных рэсурсаў, якія з'яўляюцца пажыўным асяроддзем для сярэдняга і буйнога бізнэсу. Пры гэтым буйны капітал у значнай ступені вызначае ўзровень навукова-тэхнічнага і вытворчага патэнцыялу развітых краін.

Адна з прычын паспяховага развіцця малога і сярэдняга бізнэсу ў краінах з развітай эканомікай заключаецца ў тым, што буйная вытворчасць не супрацьпастаўляецца дробнай. Калі буйныя формы прадпрымальніцтва садзейнічаюць павышэнню агульнагаспадарчай эфектыўнасці за кошт эканоміі на маштабах дзейнасці, то малыя надаюць гаспадарцы гнуткасць, мабільнасць, здольнасць да хуткіх структурных і тэхналагічных зменаў.

Далейшае правядзенне лібералізацыі эканомікі будзе садзейнічаць таму, каб вядучая роля паступова пераходзіла да прыватнага сектара. Згодна з прагнозам Міністэрства эканомікі, доля малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў аб'ёме ВУП павінна ўзрасці з 18,8% у 2009 годзе да 30% у канцы 2015 года. Колькасць суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, у тым ліку і індывідуальных прадпрымальнікаў, у разліку на тысячу чалавек у рэспубліцы павялічыцца з 32 да 42 суб'ектаў. Колькасць занятых у сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва таксама вырасце — з 26,6% да 44% ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы.

***— У кантэксце папярэдняга пытання — якую ролю павінны выконваць індывідуальныя прадпрымальнікі і, на Вашу думку, ці існуе патрэба вярнуць ім права наймаць не толькі сваіх родзічаў?***

— Пытанне аб адмене абмежавання колькасці наёмных працаўнікоў у індывідуальных прадпрымальнікаў выклікала разыходжанні меркаванняў як у органах дзяржаўнага кіравання, так і ў прадпрымальніцкім асяродку. З аднаго боку, прадстаўленне магчымасці прыцягнення індывідуальнымі прадпрымальнікамі наёмных працаўнікоў не толькі з членаў сям'і і блізкіх родзічаў забяспечыць вывад значнай часткі грамадзян з ценявой эканомікі, працаўладкаванне зарэгістраваных на біржы і якасці беспрацоўных, і, адпаведна, забяспечыць дадатковыя паступленні ў бюджэт за кошт даплаты адзінага падатку па прыцягнутых індывідуальнымі прадпрымальнікамі фізічных асобах. Па папярэдніх падліках — гэта больш за 450 мільярдаў рублёў. Але калі паглядзець з іншага боку, такая мера створыць няроўныя канкурэнтныя ўмовы для індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць аналагічныя віды дзейнасці. Я лічу, што паляпшэнне ўмоў для стварэння і фукцыянавання суб'ектаў прадпрымальніцтва павінна садзейнічаць таму, каб бізнэс па меры назапашвання капіталу імкнуўся да пашырэння сваёй дзейнасці, пераходзячы да арганізацыйна-прававых формаў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці — ПУП, ААТ, ТДА і іншых.

***— Мікалай Генадзьевіч, а як Вы лічыце — ці ёсць у беларусаў наогул схільнасць для прадпрымальніцтва?***

— Прадпрымальніцтва — гэта перш за ўсё магчымасць выбару сферы дзейнасці ў адпаведнасці з індывідуальнымі рысамі характару і здольнасцямі, гэта імкненне да незалежнасці, жаданне мець упэўненасць у выніковасці ўласнай дзейнасці, і, безумоўна, — вялізная праца і рызыка. А прадпрымальнік — гэта чалавек ініцыятыўны, энергічны, з развітай інтуіцыяй, стрэсаўстойлівы, смелы і гатовы да рызыкі. На мой погляд, у беларускай нацыі ёсць усе неабходныя якасці для занятку гэтым відам дзейнасці. Падцвярджэннем таму служыць штогадовае павелічэнне колькасці ахвотных стварыць свой бізнэс: напрыклад, колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў па звестках на 1 лістапада 2010 года склала 233 009 чалавек, што больш на 13 006 чалавек, чым было 1 лістапада 2009 года (на 5,9%), а колькасць суб'ектаў малога прадпрымальніцтва (юрыдычных асоб) склала на 1 лістапада 2010 года 85 324, што больш на 7 397 у параўнанні з 1 лістапада 2009 года (рост на 9,5%).

***— З улікам пераходу да свабоднага цэнаўтварэння ці існуе неабходнасць яшчэ больш узмацніць пазіцыі антыманапольных органаў? Ці ёсць патрэба ў стварэнні асобнага моцнага органа, які б займаўся толькі пытаннямі антыманапольнага рэгулявання?***

— Ва ўмовах лібералізацыі эканомікі і скарачэння цэнавага рэгулявання прыярытэтам з'яўляецца антыманапольнае рэгуляванне, якое з'яўляецца больш прагрэсіўным рыначным метадам дзяржаўнага ўздзеяння. У сувязі з гэтым урадам Беларусі ажыццяўляюцца меры, накіраваныя на падтрыманне добрасумленнай канкурэнцыі і ўдасканаленне антыманапольнага рэгулявання. 16 студзеня 2010 года набыў моц Указ Прэзідэнта «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні антыманапольнага рэгулявання і развіццю канкурэнцыі» № 499 ад 13 лістапада 2010 года. Ён накіраваны на забеспячэнне ўмоў для развіцця добрасумленнай канкурэнцыі, для стварэння і эфектыўнага функцыянавання таварных рынкаў. Гэты дакумент дазваляе пашырыць правы антыманапольнага органа ў частцы магчымасці прымянення дзейсных мераў, накіраваных на спыненне манапольных дзеянняў органаў кіравання і юрыдычных асоб, якія прыводзяць да абмежавання ці знішчэння канкурэнцыі праз парушэнне правоў іншых суб'ектаў гаспадарання на свабодную канкурэнцыю. Таксама Указ спрашчае адміністрацыйныя працэдуры антыманапольнага кантролю за эканамічнай канцэнтрацыяй.

11 сакавіка 2010 быў падпісаны Указ Прэзідэнта № 149 «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта ад 19 мая 1999 года № 285 і ад 23 кастрычніка 2006 года № 631». Гэтым дакументам прадугледжана выдзяленне ўпраўленняў антыманапольнай і цэнавай палітыкі ў самастойныя структурныя падраздзяленні аблвыканкамаў. Прыняцце гэтага Указа дазволіла забяспечыць умовы для развіцця добрасумленнай канкурэнцыі, эфектыўнага функцыянавання мясцовых таварных рынкаў. Упраўленні атрымалі магчымасць ажыццяўляць дзейсную абарону ўнутранага рынку рэспублікі ад нядобрасумленнай канкурэнцыі ва ўсіх яе праявах, у тым ліку праз прыняцце адпаведных папераджальных, арганізацыйных, антыманапольных мераў.

У бліжэйшы час, у сувязі з фарміраваннем прававой базы адзінай эканамічнай прасторы ЕўрАзЭС, нацыянальнае заканадаўства ў галіне канкурэнтнай палітыкі падлягае гарманізацыі, у тым ліку і ў частцы наяўнасці адпаведнага нацыянальнага органа дзяржаўнай ўлады. У яго кампетэнцыю ўваходзіць рэалізацыя антыманапольнай (канкурэнтнай) палітыкі, што мае на ўвазе, акрамя іншага, і надзяленне такога органа паўнамоцтвамі па кантролю за выкананнем забароны на антыканкурэнтныя дзеянні, забароны на нядобрасумленную канкурэнцыю, кантролю за эканамічнай канцэнтрацыяй, а таксама паўнамоцтвы па прадухіленні і выяўленні парушэнняў канкурэнтнага (антыманапольнага) заканадаўства, па прыняцці мераў для спынення гэтых парушэнняў і для прыцягнення да адказнасці за іх.

***— Як Беларусь пераадолела крызіс? Які стан рэчаў на сёння ў эканоміцы? З якімі паказчыкамі мы выйдзем на канец года?***

— Найбольш вострая фаза крызісу запатрабавала прыцягнуць знешнія рэсурсы. Было заключана пагадненне аб праграме стэнд-бай з МВФ, для чаго спатрэбілася прыняць шэраг мераў па ўзмацненні жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі і па абмежаванні бюджэтнага фінансавання інвестыцый. Безумоўна, гэта дало стрымліваючы эфект для развіцця эканомікі. Аднак пры стабілізацыі сітуацыі былі прынятыя меры па змякчэнні ціску на рэальны сектар эканомікі і валютны рынак, а таксама праз гэта і на сацыяльную атмасферу ў краіне. Ва ўмовах абмежаванасці попыту на знешніх рынках праз рэалізацыю дзяржаўных праграм было зроблена стымуляванне ўнутранага попыту, што, у канчатковым выніку, дазволіла нейтралізаваць рэцэсію. Такім чынам, пачынаючы з 4 квартала 2009 года, мы маем устойлівую дынаміку аднаўлення тэмпаў росту ў большасці сектараў эканомікі. Па выніках студзеня—кастрычніка Беларусь з'яўляецца адным з лідараў па тэмпах эканамічнага росту — 106,8%.

Але хацелася б утрымацца ад канчатковых высноў пра тое, што сёння ўсе наступствы крызісу пераадолены. Яшчэ існуе адставанне тэмпаў эканамічнага росту ад прагнозных паказчыкаў, што звязана з недастаткова хуткім аднаўленнем эканомік асноўных гандлёвых краін-партнёраў.

Пры гэтым на фоне ўзмацнення пазітыўных тэндэнцый у эканоміцы і фінансавай сферы зніжаецца агульны ўзровень працэнтных ставак для павышэння даступнасці крэдытных рэсурсаў пры захаванні магчымасці забеспячэння прывабнасці дэпазітаў у банках. З пачатку 2010 года Нацыянальны банк 6 разоў ажыццяўляў зніжэнне стаўкі рэфінансавання па 0,5 працэнтных пункта — на сёння яе ўзровень складае 10,5% гадавых.

У гэтым годзе адзначаецца паступоване паляпшэнне якасных параметраў працы прамысловага комплексу краіны: расце рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі (з 3,8 % у студзені да 10% у верасні), назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя росту вытворчасці новай прадукцыі (з 16,8% у студзені да 20,1% у кастрычніку), зніжаецца доля стратных арганізацый (з 23,9% да 18,2% у верасні).

Індыкатарам аднаўлення канюнктуры рынку з'яўляюцца паказчыкі знешняй эканамічнай дзейнасці. За студзень-верасень 2010 года аб'ём знешняга гандлю таварамі прырос на 18,4 %. На экспарт мы паставілі нашых тавараў на 16,8 % больш, чым за гэты ж перыяд 2009 года. У Расійскую Федэрацыю, на долю якой прыходзіцца 40% агульнага аб'ёму экспарту, экспарт беларускіх тавараў за студзень-верасень 2010 года вырас на 48,6%.

На 2010 год быў запланаваны рост ВУП у памеры 111-113%. Гэта напружаны паказчык, але ўрад прымае ўсе намаганні па яго дасягненні.

У цэлым жа можна казаць, што наступствы сусветнага фінансавага крызісу пераадольваюцца паспяхова, што эканоміка вярнулася на шлях дынамічнага развіцця. У першую чаргу гэта знайшло адлюстраванне ў магчымасці значна павысіць узровень зарплаты ў гэтым годзе, забяспечыць высокія ў параўнанні з іншымі краінамі тэмпы росту прамысловасці, паскорыць інвестыцыйны працэс.

***— Якія праблемы найбольш востра стаяць перад беларусамі і нашай эканомікай, як будзе развівацца наша краіна ў бліжэйшую пяцігодку, якія пастаўлены задачы?***

— Згодна з апошнімі звесткамі Праграмы развіцця ААН па абагульняючым паказчыку ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краін — індэксу развіцця чалавечага патэнцыялу — Рэспубліка Беларусь перасунулася на 61 месца з 68-га па выніках мінулага года, апярэдзіўшы пры гэтым усе краіны СНД, і ўвайшла ў групу краін з высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу.

Разам з тым падчас рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у прайшоўшай пяцігодцы не ўдалося ў поўнай меры вырашыць шэраг праблем, якія аказваюць стрымліваючы ўплыў на дынамічнае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Захавалася недастаткова эфектыўная структура эканомікі, якая выражаецца ў высокіх імпартаёмістасці, матэрыялаёмістасці і энергаёмістасці выпускаемай прадукцыі, адносна нізкай прадукцыйнасці працы і, як вынік, недастатковай канкурэнтаздольнасці прадукцыі айчыннай вытворчасці. Зніжалася эфектыўнасць інвестыцый, і марудлівымі тэмпамі павялічваўся аб'ём прыцягнення ў эканоміку прамых замежных інвестыцый. Слабай аказалася ўспрымальнасць прадпрыемствам і арганізацый да інавацый. Па-ранейшаму назіралася незбалансаванасць са знешнім гандлем. Дзяржаўная палітыка сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гады грунтуецца на прынцыпах пераемнасці і прыярытэтаў, якія былі сфармуляваныя і рэалізоўваліся ў папярэднія гады, і будзе накіраваная на вырашэнне названых вышэй праблем і пераадоленне абмежаванняў эканамічнага росту, што дазволіць забяспечыць устойлівыя тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і істотнае павышэнне ўзроўню дабрабыту насельніцтва ў сярэднетэрміновай перспектыве.

Для дынамічнага развіцця патрабуецца больш актыўнае ўдасканаленне і мадэрнізацыя існуючых арганізацыйна-эканамічных механізмаў і інстытутаў, якія дазволяць павысіць эфектыўнасць, устойлівасць і канкурэнтаздольнасць існуючай мадэлі развіцця Рэспублікі Беларусь. Асноўныя напрамкі ўдасканалення прадугледжваюць фарміраванне нацыянальнай інавацыйнай сістэмы, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы і павелічэння прытоку інвестыцый у эканоміку, развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў мэтах забеспячэння ўстойлівасці дзяржаўнай фінансавай сістэмы, пашырэнне самастойнасці і адказнасці рэгіянальных і мясцовых органаў кіравання ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем.

***— Вы шмат сустракаецеся з замежнымі партнёрамі і калегамі. Калі ласка, падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад гэтых сустрэч, які імідж мае наша краіна ў вачах замежных чыноўнікаў і бізнэсменаў, наколькі яны гатовыя супрацоўнічаць з Беларуссю?***

— Так, вы маеце рацыю — мне даводзіцца сустракацца як з кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, кіраўнікамі эканамічных ведамстваў замежных дзяржаў, так і з прадстаўнікамі дзелавых колаў. Бо наша краіна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы і са многімі еўрапейскімі краінамі нас звязвае не толькі геаграфія, але і эканоміка, гісторыя, культура. Магу канстатаваць, што інтарэс нашых замежных партнёраў да працэсаў, што адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь, значна вырас. Замежных партнёраў цікавіць перш за ўсё пытанні прыватызацыі, інвестыцыйнага клімату, шмат пытанняў адносна ўдзелу Беларусі ў Мытным саюзе, пра тое, што яшчэ плануецца зрабіць па далейшай лібералізацыі нашай эканомікі. У апошнія гады ўстойлівы і выніковы характар набыло супрацоўніцтва Беларусі з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі: Міжнародным валютным фондам, Сусветным банкам, Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця.

Што датычыцца гатоўнасці замежных партнёраў супрацоўнічаць з Беларуссю, то я хачу прывесці некаторыя прыклады. У 2009 годзе аб'ём замежных інвестыцый, што паступілі ў эканоміку Беларусі, у параўнанні з 2008 годам вырас на 42,6 %, а аб'ём прамых замежных інвестыцый — у два разы. У красавіку гэтага года завершаная праграма фінансавай падтрымкі МВФ «стэнд-бай» у памеры каля 3,5 мільярда долараў, Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця павялічыў аб'ём крэдытных рэсурсаў на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў рэспублікі. Таксама ў падтрымку намаганняў урада Сусветным банкам была прадстаўлена пазыка на мэты развіцця. У практычную плоскасць пераведзены працэс прыцягнення ў беларускую эканоміку крэдытна-інавацыйных рэсурсаў Еўрасаюза. Мы ўдзельнічаем у шматбаковым фармаце ініцыятывы ЕС «Усходняе партнёрства» па лініі ўсіх яе чатырох платформаў. Актыўна прасоўваюцца галіновыя дыялогі з Еўракамісіяй у сферах энергетыкі, транспарту, экалогіі, мытні, сельскай гаспадаркі, стандартызацыі, эканомікі і фінансаў. Былі падпісаныя і набылі моц шэраг дамоў з ЕС, якія рэгулююць адносіны ў сферы тэхнічнай дапамогі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ЗАГІНУЎ ВЯДОМЫ ВУЧОНЫ

**У мінулую пятніцу член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Іван Нікітчанка трапіў у дарожна-транспартнае здарэнне.**

Паводле звестак ДАІ УУС Мінаблвыканкама, каля трох гадзін машына прафесара «Фальксваген» на 56-м кіламетры аўтадарогі Мінск—Маладзечна сутыкнулася з грузавіком «Зіл». У гэтай аварыі пацярпеў вучоны, які быў дастаўлены ў бальніцу, але ўрачам, на жаль, не ўдалося выратаваць яго жыццё.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПРЫШЧАМІЛА ДЗВЕРЦАМІ РУКУ МЫТНІКА

**Хаваючы кантрабандны тавар, жанчына аказала супраціўленне пагранічнікам. Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў прэс-цэнтры Дзяржпагранкамітэта.**

Брэсцкія пагранічнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі на аўтадарозе Маларыта — Кобрын затрымалі аўтамабіль «Нісан». Першае патрабаванне пагранічнага наряда аб спыненні вадзіцель праігнаравала, таму праз 200 м яе ўжо чакаў другі рубеж кантролю, на якім разам з пагранічнікамі працавалі супрацоўнікі міліцыі. Вадзіцелем аказалася 36-гадовая жыхарка Маларыцкага раёна. «Падчас праверкі документаў яна раптоўна зацяснула руку пагранічніка шклом вадзіцельскай дзверцы, пасля чаго аўтамабіль рэзка пачаў рух. Пагранічнік паспеў свабоднай рукой разбіць шкло і выцягнуць ключы з замка запальвання. Абышлося без ахвяраў», — расказалі ў прэс-цэнтры.

У аўтамабілі былі знойдзены дзве сумкі з кантрабандным адзеннем. У цяперашні час жанчына дае паказанні ў Кобрынскім РАУС.

## ЗБІЎ НАГАМІ ЦЯЖАРНУЮ

Беспрацоўны з в. Спорава (Бярозаўскі раён) сярод белага дня, на вуліцы, збіў нагамі былую жонку, якая знаходзілася ў дэкрэтным водпуску на 9-м месяцы цяжарнасці.

Ад пабояў у жанчыны цяжарнасць перарвалася. Раней мужчына ўжо быў судзімы за здзекі, а цяпер знаходзіцца на лячэнні ў бальніцы.

Заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Абзац

**◢ За мінулую пятніцу і выхадныя дні на дарогах Беларусі загінулі 26 чалавек, з іх двое дзяцей.**

◢ Таксі перакулілася ў цэнтры Мінска. ДТЗ адбылося ўчора на перасячэнні вуліц Свярдлова і Кірава. Кіроўца таксі — легкавой машыны Renault — рухаўся па вуліцы Свярдлова і пачаў паварочваць. Аднак ён не саступіў дарогу другому аўтамабілю Renault, які ехаў насустрач і таксама паварочваў. У выніку легкавікі сутыкнуліся: таксі перакулілася, а іншая машына ўехала ў святлафор. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Вядзецца праверка.

**◢ У Рэчыцкім раёне 20 лістапада з кабіны трактара выпала дзевяцігадовая дзяўчынка і атрымала траўмы, ад якіх памерла па дарозе ў бальніцу. Трагедыя здарылася ў вёсцы Вышамір. Падчас руху трактара «Т-16», якім кіраваў вадзіцель 1966 года нараджэння, пры павароце на скрыжаванні вуліц з кабіны выпала дзяўчынка.**

◢ Чатыры чалавекі загінулі ў Беларусі на чыгуначных пуцях за выхадныя і пятніцу. У Бабруйску пад коламі цягніка загінуў 24-гадовы мясцовы жыхар, на прыпыначным пункце Ласі — 60-гадовая пенсіянерка з Маладзечанскага раёна. На перагоне Зябраўка-Церахоўка дызель-цягнік насмерць збіў 48-гадовага мужчыну з Добрушскага раёна. У Асіповічах манеўровы цягнік смяротна траўмаваў 39-гадовую мясцовую жыхарку.

**◢ 29-гадовы вадзіцель аўтамабіля «Аўдзі», рухаючыся па аўтадарозе Рэчыца — Лоеў, учыніў наезд на дзвюх 16-гадовых дзяўчат, якія перасякалі праезную частку ў неўстаноўленым месцы. У выніку ДТЗ адна з дзяўчат ад атрыманых траўмаў памерла па дарозе ў бальніцу, другая атрымала цялесныя пашкоджанні.**

◢ У Хойніцкім раёне на будоўлі сельскага Дома культуры вёскі Вялецін загінуў рабочы ТДА «Аграбудпрам». Падчас будаўнічых работ адбылося частковае абрушэнне сцяны ўнутры будынка, пры гэтым быў смяротна траўмаваны 51-гадовы рабочы, які знаходзіўся побач. Праводзіцца праверка.

## Поўны абзац

**◢ У продаж паступяць прэзерватывы з дзьмухаўцоў. Аказваецца, з гэтай расліны можна рабіць не толькі вянкі, варэнне і віно. Нямецкія навукоўцы прапануюць выкарыстоўваць іх для вытворчасці такога необходнага прадмета, як прэзерватыў. Навукоўцы знаходзяцца ў фінальнай стадыі распрацоўкі тэхналогіі, якая дазваляе здабываць з дзьмухаўцоў палімер, які не саступае па сваіх якасцях латэксу. Тэхналогію мяркуюць укараніць на працягу бліжэйшых 2-х гадоў, і ў першую чаргу з гэтай экалагічна чыстай сыравіны будуць рабіць прэзерватывы. Першыя кандомы з дзьмухаўцоў могуць паступіць у продаж ужо ў 2012 годзе.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧТПУП «Минская межрайбаза ОПС» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже зданий:**

**Лот № 1**: магазин, об. пл. 56,7 кв.м, расположенный по адресу: **Минская область, Роговский с/с, д. Кукелевщина.**

Начальная цена с НДС – **6 000 000 бел. руб.**

**Лот № 2**: магазин № 119, об. пл. 32,8 кв.м, расположенный по адресу: **Минская область, Роговский с/с, д. Ашнарово.**

Начальная цена с НДС – **5 000 000 бел. руб.**

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.09.2010.

Аукцион состоится **7.12.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **6.12.2010** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

**10 декабря 2010 г. в 15.00 состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «БЕЛДОРТЕХНИКА»**

Место проведения:
г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», актовый зал.

**Повестка дня:** Об оказании безвозмездной спонсорской помощи в 2010 году футбольному клубу «Дорожник».

С информацией можно ознакомиться: в рабочие дни (понедельник—пятница) с 14.00 до 16.00, по месту нахождения Общества (комната 312), начиная с 10.12.2010 г.

УНП 100135303

## З ЧАЦВЯРГА — ЗІМА

Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА, з чацверга на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць халодныя паветраныя масы арктычнага паходжання. Чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу. На дарогах месцамі магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў чацвер складзе ад 4 градусаў марозу да 1 градуса цяпла. Удзень чакаецца каля 0. У пятніцу, 26 лістапада, стане на пару градусаў халадней. Тэмпература ў начныя гадзіны панізіцца да мінус 1-6 градусаў. Пры праясненнях слупок будзе паказваць 8 градусаў марозу. Удзень у паўночных раёнах чакаецца 5 градусаў ніжэй за нуль, на поўдні рэспублікі — да 1 градуса цяпла.

Паводле папярэдніх разлікаў, у выхадныя дні ўтрымаецца зімовае надвор'е. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2-7 градусаў марозу, пры праясненнях будзе да мінус 10 градусаў. Удзень чакаецца ад 0 да 6 градусаў марозу. Як адзначыла Вольга Фядотава, такі тэмпературны фон на 2-5 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму.

# ГРЫБНЫ СЕЗОН ЗАВЕРШАНЫ?

**Здаецца, у 2001 годзе ў грыбы я ездзіў 4 лістапада. І хоць пазней г

# «ЗГРЭБЦІ ВЁСКУ Ў ДНЯПРО?»

**НЕЧАКАНАЯ просьба прагучала ў лісце, які прыйшоў у рэдакцыю з вёскі Асарэвічы Брагінскага раёна. Звычайна жыхары клапоцяцца пра тое, каб дзеці вучыліся ў сваёй вёсцы, і калі просяць дапамагчы — дык паспрыяць, каб не закрывалі ў іх невялічкім населеным пункце ўстанову адукацыі. У гэтым звароце — наадварот: патрабаванне школу закрыць, а вучняў вазіць у суседнюю. Жанчына, якая прасіла не называць яе імя, піша, што вельмі непісьменнымі выходзяць з іх школы выпускнікі, ніхто з іх не паступае ў ВНУ. І настаўнікі, якія выкладаюць тут, не могуць даць сапраўднай адукацыі ні сваім дзецям, ні яе дзіцяці. Дарэчы, цытата па тэксце, арфаграфію захоўваю: «В Асаревицкай школе ни один учитель не имея категории, не отдае атдачи своего труда», «Ведь школа Асаревичи на 14 учаников расходеца в год десятки милионов государственых денег». І так на дзвюх старонках.**

Але ж справа ў тым, што ў «Асарэвіцкім вучэбна-педагагічным комплексе дзіцячы сад-базавая агульнаадукацыйная школа» дзеці не атрымліваюць сярэднюю адукацыю, а значыць, пасля 9 класаў паступаюць у сярэднія спецыяльныя ўстановы або вучацца далей, каб паступаць у вышэйшыя. Вучняў тут зараз 25. 13 выхаванцаў у дзіцячым садку і 9 — у сацыяльным прытулку. З з 9 педагогаў мае вышэйшую катэгорыю, 3 — першую і 2 — другую. Такія разыходжанні з аўтарам ліста ў рэдакцыю, якая рэкамендавалася нашай пастаяннай падпісчыцай на працягу 18 гадоў, мяне прымусілі моцна засумнявацца ў тым, што змест ліста з Асарэвічаў адпавядае рэчаіснасці. Хацела пагаварыць з чытачкай асабіста, але ж на Брагінскай раённай пошце мне назвалі ўсіх (двух) падпісчыкаў «Звязды» з гэтай вёскі. Прозвішча, якое стаіць на звароце, сярод іх не было. Больш за тое, высветлілася, што ў вёсцы ніколі не было чалавека з такім прозвішчам.

Далей — болей. Аказваецца, лісты з аналагічным зместам ідуць ва ўсе інстанцыі як мінімум два разы на год. Прынамсі, **начальнік аддзела адукацыі Брагінскага райвыканкама Аляксандр КАЛЯСАН** атрымлівае іх штогод вясной і восенню, і змест заўсёды аднолькавы. І подпісы стаяць заўсёды розныя — неіснуючыя:

— Я тры гады працую, і кожны год мы разбіраем гэтую скаргу. Той, хто піша, падпісваецца рознымі прозвішчамі. Людзі ў вёсцы кажуць: гэта адзіная ўстанова культурна-адукацыйная, куды ходзяць і дзеці, і дарослыя. Пра якое закрыццё можа ісці размова?

**Старшыня Нова-Іалчанскага сельскага выканаўчага камітэта Валянціна СВІСЛОЎСКАЯ** таксама не здзівілася, калі я расказала пра скаргу:

— Ананімкі пастаянна ідуць — правяраем кожнае названае прозвішча. Колькі ўжо разоў прыходзілі скаргі пад рознымі прозвішчамі, але ж адным почыркам напісаныя! Для вёскі сёння закрыць школу — лічы, пакінуць яе памяраць. Спачатку там сельскі Савет да нашага далучылі, потым іх гаспадарку аб'ядналі з Камарынскай. Жыло там калісьці 600 чалавек, а цяпер людзі пачалі ад'язджаць — таму што працы няма. Цяпер — крыху больш за 320 чалавек засталося. Вёска за апошнія гады ператварылася ў неперспектыўную. Яшчэ і школу закрыць — зусім памрэ.

Хто лепш ведае пра сітуацыю ў школе, дык гэта бацькі. Знайсці іх у Асарэвічах не склала цяжкасцяў. Маладая маці Жанна Пацук выхоўвае дваіх дзетак:

— У мяне дзіця-інвалід, і яму непажадана было б кудысьці ездзіць. Я супраць таго, каб школу нашу закрылі. Мне вельмі падабаюцца настаўнікі. Майму дзіцяці год нельга было наведваць школу — настаўнікі прыходзілі дадому, усяму вучылі. Цяпер ён ходзіць у школу, і яму вельмі падабаецца.

У Пугач Алены Віктараўны — пяцёра дзетак. Двое закончылі школу, адзін вучыцца, а двое ў садку выхоўваюцца:

— Пра школу магу казаць толькі самае добрае. Настаўнікі добрыя і добрую адукацыю дзеці атрымліваюць. Настаўнікі заўсёды цікавілія, чаму дзіця ў школу не прыйшло. Добрая абстаноўка, як дома. Старэйшая дачка гэтую школу заканчвала, потым — каледж, цяпер працуе бухгалтарам. Сын збіраецца на кухара паступаць. Яшчэ адна дачка вучыцца ў каледжы народных мастацкіх прамыслаў у Гомелі. Двое дзетак у садочку — там выхавацелі вельмі добрыя, дзетак развіваюць, я сама на занятках прысутнічала. За кожным дзіцем глядзяць вельмі ўважліва. Я спакойная за сваіх дзяцей. Самую маленькую аддала ў садок у год і 4 месяцы — калі б не давярала, ці аддала б я дзіця? Другую — у 2 годзікі. Мы сёння засталіся без ФАПа — таксама хтосьці пісаў-пісаў, што там ніхто нічога не робіць. А цяпер, атрымліваецца, што і ўкол няма каму зрабіць!

Чацвярых выхавала Ніна Рыгораўна Чарнянок. Апошняя дачка вось толькі паступіла ў Лоеўскі педагагічны каледж вучыцца:

— У школе дзеці нашы навучыліся і паважаць старэйшых, і разумець тых, хто побач... Усё школа дала. Сям'я і школа пастаянна былі ў кантакце — усё разам вырашалі. Калектыў там нармальны. Запрашалі пастаянна. Прыходзіш у школу — там і песню праспяваюць для бацькоў, і падарунак падораць — хіба хто не рады?

Сяргей Пацук працуе сацыяльным педагогам у прытулку. Да сваіх дваіх у яго яшчэ двое прыёмных дзетак. Праблемы вёскі і «цяжкіх» дзяцей, якіх адабралі ў бацькоў, ён ведае, як ніхто. І лічыць, што дзякуючы заняткам у школе нават такія дзеці атрымліваюць годную адукацыю. І паступаюць вучыцца далей:

— Мае дзеткі малыя — адна ў першым, другая — у чацвёртым. Хлопчык прыёмны ў мяне ходзіць у восьмы клас, вельмі адстае. Мы яго шкадуем — ён з цяжкай сям'і. Я вельмі хачу, каб маленькія падраслі ў нашай школе — не хачу адпраўляць у Краснае за 12 кіламетраў. Гэта ж далёка — і захваросць дзіця можа, і аўтобус можа зламацца. Не хацелася б, каб мае дзеткі ездзілі кожны дзень у школу. А ў нашай школе да дзяцей ставяцца добра, вучаць іх усяму. Тым больш, усё ўжо пазакрывалі. Я кажу — мо трэба згрэбці вёску ў Дняпро, хай плыве на Кіеў, тады людзям увогуле не будзе за што чапляцца... Калі тут хоць трохі моладзі засталося — няхай яна жыве.

Ведаю, наколькі складанае жыццё ў жыхароў Брагінскага раёна, пакрыўджанага чарнобыльскай бядой болей за іншыя, але гэта іх зямля, іх радзіма, іх свядомы выбар, і яны хочуць тут жыць — навошта перашкаджаць? Складана зразумець логіку невядомага аўтара ліста, які даў падставу для гэтага міні-расследавання. Можа, гэта і не логіка ўвогуле. Так, піша, бо сумна жыць, калі камусьці лепш, чым яму. А можа, банальная асабістая непрыязнасць да кагосьці асабіста выліваецца на паперу. І радуецца ананімшчык патаемна, што зноў і зноў ідуць у школу шматлікія праверкі, зноў кіраўнікам вымаюць душу і прымушаюць даказваць, што белае — гэта белае. Безумоўна, аднавяскоўцы здагадваюцца, хто гэта робіць, але ж за руку асарэвіцкага «пісьменніка» пакуль не злавілі. Вось і я час змарнавала, пакуль прымушала апраўдвацца людзей у тым, у чым яны не вінаватыя. Прабачце, калі ласка, шаноўныя.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



# ЧАРГІ НЕ БЫЛО...

**НА мінулым тыдні Баранавічы наведаў намеснік генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Аляксей СТУК. Чаму выбар прыпаў на Баранавічы?**

— Штоквартальна кіраўніцтва пракуратуры Беларусі, а таксама начальнікі структурных падраздзяленняў выязджаюць на перыферыю, каб пазнаёміцца са станам спраў на месцы. Наша задача — умяшацца, калі скаргі грамадзян не разглядаюцца ці існуе валакіта, — заявіў Аляксей Стук.

**— Баранавічы і раён у плане скаргаў выклікаюць непакой?**

— Выбар прыпаў не толькі на Баранавічы, але яшчэ і на Ляхавіцкі раён. Хоць і ёсць некаторае павелічэнне скаргаў, але гэты рэгіён не з'яўляецца праблемным і не вылучаецца на фоне іншых. Акрамя гэтага я курырую Брэсцкую вобласць, і мой прыезд можна лічыць заканамерным.

На сустрэчах з прадстаўнікамі Адміністрацыі Прэзідэнта, Камітэта дзяржкантролю, Міністэрства юстыцыі людзі, як правіла, скардзяцца на розныя структуры мясцовай улады, суды, а да пракуратуры асабліва прэтэнзій не даводзілася чуць. Між тым, пракуратура ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў, і ад яе дзеянняў таксама залежыць стабільнасць у грамадстве.

Складваецца ўражанне, што наш чалавек не ведае, як дзейнічаць у нейкіх канфліктных абставінах. У пераважнай большасці пакрыўджаныя пішуць у высокія інстанцыі па вертыкалі і забываюць, што можна было б па нейкім пытанні звярнуцца і ў пракуратуру.

**— Аляксей Канстанцінавіч, з якімі скаргамі найчасцей даводзіцца сутыкацца пракуратуры?**

— Гэта пытанні, якія падпадаюць пад агульны нагляд і знаходзяцца ў кампетэнцыі пракуратуры. І яны самыя балючыя. Найбольш даймаюць людзей жыллёвыя, працоўныя праблемы, а таксама звязаныя з ЖКГ... Напрыклад, шмат прэтэнзій да будаўнікоў, якасці будаўніцтва... Вось і даводзіцца высвятляць, чый брак — звязаны ён з якасцю матэрыялаў ці яго дапусцілі будаўнікі?

**— Наколькі задавальняюцца пракуратурай падобныя скаргі?**

— Яшчэ раз хачу падкрэсліць, пракуратура ўмешваецца ў сітуацыю ў межах сваёй кампетэнцыі, і калі ўзнікае неабходнасць, то пракуратура падключаецца і выпраўляе становішча. Прыкладна, 8—15 працэнтаў скаргаў па тых ці іншых пытаннях задавальняюцца.

**— Сталіца далёка, а на перыферыі жыццё цячэ сваім рэчышчам...**

— Генеральная пракуратура не пакідае перыферыю на самацёк. Калі ёсць парушэнні ці на месцы не рэагуюць на скаргі, то даводзіцца ўмешвацца.

Сустрэчы адбыліся ў мясцовым лясгасе, заводзе ЖБВ і ў вёсцы Крошын, пад Баранавічамі.

Фізічна не было магчымасці пабываць на ўсіх прыёмах, але ў лясгасе, напрыклад, былі заданыя толькі два пытанні. Чамусьці на сустрэчу з намеснікам генеральнага пракурора людзі не спяшаліся. А дарэмна.

**Пытанне: У кватэры прапісаны трое. Людзі там не жывуць, але і жыллё не вызваляюць. Прымусова іх можна выселіць?**

— Жыллё службовае ці ведамаснае?

**— Ведамаснае, у свой час чалавек працаваў у лясгасе і атрымаў тую кватэру.**

— Значыць, жыллё атрымана законна, а калі ёсць прэтэнзіі, то неабходна звярнуцца ў суд.

**Пытанне: Калі фізічная асоба парушыла закон і яе неабходна прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці, а чалавек не хоча ісці на працэс, то міліцыя можа яго даставіць. А што рабіць з юрыдычнай асобай, напрыклад, дырэктарам завода, які ігнаруе разгляд справы?**

— Неабходна чалавека папярэдзіць. Патэлефанаваць, адправіць тэлеграму...

**— А ён ігнаруе.**

— І над дырэктарам ёсць начальнік. Неабходна звярнуцца да вышэйшага...

Перад амерыканскай Фемідай такая праблема не стаіць. Там кожны, каго выклікалі ў суд, бярэ адваката і спяшаецца туды. І статус чалавека ў грамадстве там не адыгрывае вялікай ролі. І нядзіўна, што знакамітая актрыса па рашэнні суда падмятае вуліцу, чысціць туалеты ці даглядае нямоглых у бальніцы.

Мне давялося чуць, як наш суддзя прасіў па тэлефоне старшыню аднаго сельгаскааператыва прыехаць на суд. Той доўга адгаворваўся і ў суд не з'явіўся. Калі такое дазваляе сабе кіраўнік гаспадаркі, то што казаць пра асобаў, якія займаюць больш высокія пасады.

Адным словам, нашай заканадаўчай уладзе ёсць над чым папрацаваць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

## Як нас дураць

## ПЕНСІЯНЕР ПАЗНАЎ МАХЛЯРА

Прайдзісвет падкладваў старым «катлеты»

**Абдураны зламыснікам больш як два месяцы таму 72-гадовы пенсіянер убачыў свайго крыўдзіцеля і выклікаў супрацоўнікаў міліцыі, якія затрымалі 31-гадовага мужчыну, паведаміла прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС Ала ГАЛУБОВІЧ.**

Махляры падпільнавалі старога ля сталічнага паштовага аддзялення, дзе ён атрымаў пенсію і накіроўваўся дадому. Невядомы, абагнаўшы пенсіянера, нахіліўся да зямлі і нешта падняў. А потым звярнуўся да чалавека са словамі, маўляў, паглядзіце, я грошы знайшоў, і прапанаваў дасканала агледзець іх у суседнім дварэ. Ужо там невядомы паклаў пакет у кішэню курткі і прысеў пакурыць. У гэты момант на «сцэне» з'явіўся іншы памагаты махляра, які заявіў пра тое, што гэта ён згубіў грошы, і запатрабаваў у пенсіянера паказаць усю наяўнасць, якую той мае. Не адчуўшы падману, стары даў пералічыць сваю пенсію, якую яму «абураны» грамадзянін праз непрацяглы час вярнуў. А пасля апошні накіраваўся да другога «шчаслівчыка» і дастаў у таго з кішэні нібыта згублены пакет. Паміж імі разгарэлася спрэчка, якая скончылася гульнёй у пагоню: адзін з махляроў, які быццам бы знайшоў грошы, пачаў уцякаць, а другі кінуўся наўздагон. А стары раптоўна выявіў, што ад пенсіі на руках няшмат грошай засталося. Устаноўлена дачыненне затрыманага як мінімум да трох аналагічных злачынстваў на тэрыторыі Фрунзенскага раёна сталіцы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Вяртаючыся да надрукаванага

# Выдаленні дрэў — на падставе абследавання. І рыбалка застанецца

**У «Звязду» паўторна (пасля выхаду публікацыі ў нумары ад 2 лістапада пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» «Замест старых дрэў пасадзяць маладыя. А рыбалку забараніць нельга») звярнулася Фаіна Андрэеўна Юнцэвіч, якая пражывае ў Докшыцах па вуліцы Дзяржынскага. Нагадаем, яна скардзілася на тое, што мясцовыя камунальнікі паспілоўвалі дрэвы на беразе возера, на яе погляд, цалкам беспадстаўна. А яшчэ хацела, каб забаранілі аматарскую рыбалку тут жа, бо рыбаловы пакідалі машыны пад агароджамі жыхароў вуліцы, брыдкасловілі, уладкоўвалі «прыбіральні» на вачах...**

Заяўніца выказала нязгоду практычна з усім, што было выкладзена ў матэрыяле. У прыватнасці, са словамі спецыялістаў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь: усё роўна настойвала, што трэба забараніць аматарскую рыбную лоўлю пад вокнамі дамоў па вуліцы Дзяржынскага. Таксама паставіла пад сумненні словы намесніка кіраўніка РУП ЖКГ «Докшыцы-Камунальнік»: сцвярджала, што скардзілася не адна, а разам з трыма суседзямі; што ніякіх прataколаў спецыяльнай камісіі, якая аглядала дрэвы, быццам бы не існуе; што самі спілаваныя дрэвы былі здаровымі.

Рэдакцыя звярнулася з просьбай у Докшыцкі райвыканкам яшчэ раз праверыць выкладзеную заяўніцай інфармацыю і даць падрабязны адказ па сутнасці пытанняў ў скарзе. Адтуль нас праінфармавалі, што «...скаргаў і зваротаў па пытанні нязгоды з акультурваннем берагавой паласы і выдаленні дрэў ад іншых жыхароў вуліцы Дзяржынскага ў РУП ЖКГ «Докшыцы-Камунальнік» ці райвыканкам не паступала. Як ужо ўказвалася раней, забараніць рыбную лоўлю не ўяўляецца магчымым (нагадаем, возера знаходзіцца ў рысе населенага пункта, адпаведна, яно адносіцца да водных аб'ектаў фонду запасу рыбалоўных угоддзяў, значыць, можа быць выкарыстанае рыбаловамі для бясплатнага аматарскага рыбалоўства — **С.Р.**).

Па пытанні выдалення дрэў і кустоўя паведамляем наступнае: камісіяй, створанай распараджэннем старшыні Докшыцкага райвыканкама ад 3.12.2007 г. № 268р, былі абследаваныя некалькі аб'ектаў раслінnага свету, што падлягалі выдаленню. Было зроблена заключэнне аб неабходнасці выдалення дрэў і кустоўя, у тым ліку ў берагавой паласе ўздоўж вуліцы Дзяржынскага. 18 кастрычніка 2010 года складзены адпаведны акт, падпісаны ўсімі членамі камісіі. 28 кастрычніка 2010 года Докшыцкім раённым выканаўчым камітэтам прынятае рашэнне № 968 «Аб выдаленні аб'ектаў раслінnага свету», на падставе якога РУП ЖКГ «Докшыцы-Камунальнік» выдадзены дазвол на выдаленне дрэў і кустоўя, ўзгодненае з начальнікам раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

У далейшым у берагавой паласе возера будуць высаджаныя культурныя дрэвы і дэкаратыўныя кусты ў адпаведнасці з нормамі высадкі ў водаахоўнай зоне».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АЎТО НЕ ДАЧАКАЛІСЯ

**Даверыўшыся індывідуальнаму прадпрымальніку, які абяцаў набыць ім аўтамабілі ў Германіі, трое жыхароў сталіцы страцілі свае грошы.**

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, 51-гадовы прадпрымальнік са снежня 2008-га па студзень мінулага года атрымаў ад сваіх кліентаў больш як 32 мільёны рублёў на пакупку аўто. Аднак «жалезных коней» у абмен на перададзеныя мільёны людзі не чакаліся: грошы падазроны прысвоіў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Рэха публікацыі

# «Праца хлебазавода знаходзіцца на кантролі праўлення Белкаапсаюза»

З лістапада ім адпрацаваны новы асартымент хлебабулачных вырабаў: з палепшанымі спажывецкімі якасцямі мякішу па смаку, паху і эластычнасці

**Выносячы гэтыя словы з афіцыйнага адказу ў загаловак, хацелася б верыць, што ў справе па скарзе Леаніда Канстанцінавіча Халадзінскага з вёскі Ляды Чэрвеньскага раёна адносна якасці (дакладней, смаку) мясцовага хлеба нарэшце будзе пастаўлена кропка. Бо гісторыя доўжылася два месяцы: пачынаючы з апублікавання першага адказу (сам запыт ад чытача паступіў раней) у нумары «Звязды» ад 5 кастрычніка, «Працягу тэмы» на старонках выдання ўжо 3 лістапада...**

Прыводзіліся і словы самога Леаніда Канстанцінавіча, і адказ дырэктара хлебазавода — філіяла «Камбінат кааператыўнай прамысловасці» Чэрвеньскага раённага спажывецкага таварыства — Аляксея Сямко, і рэагаванне з Чэрвеньскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Калі коратка нагадаць сутнасць гэтага своеасаблівага «процістаяння», дык асобы пры пасадзе гаварылі: ніякіх парушэнняў (і мы ў гэтым не сумняваліся) пры выпуску хлеба няма. А чытач ім — і пры вочных сустрэчах, і ў завочнай спрэчцы на старонках газеты — парыраваў проста: але нясмачны! Вось мінскі — іншая справа, але яго пры завозе часам не на ўсіх хапае. Таму ў «Працягу тэмы» ад 3 лістапада мы нават у загаловак і падзагаловак вынеслі словы: «Хлеб павінен быць якасным? Ці смачным? Гэтыя паняцці ўзаемазвязаныя ці кожнае — паасобку?» Як на апошнюю інстанцыю, спадзяваліся на Белкаапсаюз: ці дасць ён нарэшце адказ на гэтыя пытанні?

Праўленне Белкаапсаюза напачатку ў цэлым інфармуе, што «рознічныя гандлёвыя прадпрыемствы Чэрвеньскага раённага спажывецкага таварыства ў асноўным вядуць рэалізацыю хлеба і хлебабулачных вырабаў вытворчасці філіяла «Камбінат кааператыўнай прамысловасці», але ў мэтах найбольш поўнага задавальнення спажывецкага попыту і павелічэння аб'ёмаў рэалізацыі хлебабулачных вырабаў адкрыта фірмовая секцыя РУП «Барысаўхлебпрам» у краме «Дары Міншчыны» г. Чэрвеня, а таксама арганізаваны гандаль прадукцыяй вытворчасці КУП «Мінскхлебпрам» у пяці крамах г.Чэрвеня і дзвюх крамах г.п. Смілавічы».

Далей паўтараецца тое, пра што двойчы пісалася ў папярэдніх матэрыялах: на працягу апошніх гадоў прэтэнзій ад пакупнікоў раёна на якасць мясцовых хлебабулачных вырабаў не паступала; не было іх і ад насельніцтва Лядзенскага сельскага Савета; адсутнічаюць скаргі і ў краме № 35 вёскі Ляды. Паўтараецца інфармацыя адносна праверак прадпрыемства, што ніякіх парушэнняў не было, што хлебазавод забяспечаны кваліфікаванымі кадрамі. Пішацца і пра тое, што ў трэцім квартале на хлебазаводзе прайшоў укараненне ў вытворчасць фармавы дыетычны хлеб «Каралінскі» з выкарыстаннем ёдаказеіну (хоць да гэтага ў адказах называўся хлеб з палепшаным саставам «Караліна», які з 22.05.2010 г. замяніў хлеб «Калядны», а ёдаказеін дагэтуль увогуле ніводнага разу не згадваўся — **С.Р.**) вагой 0,85 кілаграма і рознічнай цаной 2 260 рублёў ва ўпакоўцы, які пастаўляўся ў гандлёвыя прадпрыемствы раёна, у тым ліку і ў вёску Ляды. Даецца пералік інгрэдыентаў і іх суадносіны. Напэўна, менавіта яго, гэты хлеб, і меў на ўвазе ўвесь час не толькі наш чытач: было некалькі аналагічных зваротаў з раёна на працягу цыкла публікацый, апошнім па часе — ад жыхара вёскі Раванічы Івана Паўлавіча Уласаўца. Нясмачны, сцвярджалі людзі, а спадар Халадзінскі яшчэ ў першым лісце наракаў і на яго кошт. Таму далейшая інфармацыя з адказу, будзем спадзявацца, задаволіць нашых заяўнікаў.

«З мэтай пашырэння асартыменту прадукцыі, што вырабляецца, і ўкаранення новых відаў прадукцыі па канкурэнтаздольнай цане, у лістападзе вядучым тэхнолагам аддзела прамысловасці Мінскага аблспажыўсаюза Т. Ёвік сумесна са спецыялістамі хлебазавода адпрацаваны новы асартымент хлебабулачных вырабаў:

хлеб «Восеньскі» фармавы (суадносіны мукі: аржаная абдзірная — 15 працэнтаў, аржаная сеяная — 50 працэнтаў, пшанічная першага гатунку — 35 працэнтаў, квасное сусла — 1 працэнт), вагой 0,85 кілаграма, рознічная цана 1930 рублёў;

хлеб «Гарадскі» фармавы вагой 0,85 кілаграма (суадносіны мукі: аржаная абдзірная — 15 працэнтаў, аржаная сеяная — 54 працэнты, пшанічная першага гатунку — 30 працэнтаў, солад — 1 працэнт) — 1 740 рублёў, ва ўпакоўцы. Цэны на даныя найменні сфарміраваныя з мінімальнай рэнтабельнасцю.

Укараненне гэтага асартыменту хлеба дазволіла палепшыць спажывецкія якасці мякішу па смаку, паху і эластычнасці, а таксама знізіць цану на адзінку прадукцыі. Кіраўніцтвам хлебазавода будзе працягвацца праца па зніжэнні выдаткаў і ўкараненні новага канкурэнтаздольнага асартыменту хлебабулачных вырабаў. Праца хлебазавода Чэрвеньскага раённага спажывецкага таварыства знаходзіцца на кантролі праўлення Белкаапсаюза».

Што застаецца пажадаць нашым чытачам? Толькі аднаго — смачна есці!

# Транспартнае пытанне паміж Прусамі і Краснадворцамі вырашанае

**У нумары газеты ад 22 кастрычніка пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» мы спрабавалі разабрацца ў скарзе мінчаніна Леаніда Паўлавіча Адзярыхі, чыя бацькоўская хата знаходзіцца ў вёсцы Прусы Салігорскага раёна. Паводле яго слоў, пасля таго як былі аб'яднаныя два сельскія Саветы, у тутэйшых жыхароў узніклі пэўныя нязручнасці.**

У прыватнасці, калі раней да канторы было тры кіламетры і да яе можна было дабрацца ў крайнім выпадку нават пехатою, дык да цяперашняга сельскага Савета — Краснадворскага — ужо каля пятнаццаці кіламетраў. А транспарт туды не ходзіць. Ёсць аўтобусны маршрут Салігорск — Прусы, аднак у Краснадворцы ён не трапляе, расказваў нам у мінулы раз чытач. Яшчэ Леанід Паўлавіч шкадаваў, што ў Прусах зачынены клуб — адзін з тых астраўкоў, у якім на вёсцы цеплілася культурнае жыццё. Хаця і сам прызнаваў, і нам тады пацвердзілі ў Краснадворскім сельскім Савеце, што асабліва хадзіць у той клуб не было каму: усяго ў вёсцы пастаянна пражывае 134 чалавекі, з якіх толькі 34 — працаздольнага ўзросту.

Як нам зноў жа патлумачылі ў мінулы раз у сельскім Савеце, патрэбныя вяскоўцам даведкі яны могуць замаўляць па тэлефоне, потым іх дашлюць заяўніку поштай. Такім чынам як бы кампенсуецца адсутнасць транспартных зносін вёскі з канторай. Хаця аб праблеме гэтай у раёне цудоўна ведалі і ўжо пэўны час абмяркоўвалі варыянт, каб двойчы на тыдзень аўтобус усё ж заходзіў у вёску.

І вось днямі мы атрымалі афіцыйны адказ-рэагаванне з Салігорскага райвыканкама. Адразу зазначым, станоўчы для вяскоўцаў — жыхароў як вёскі Прусы, так і іншых.

«Для вырашэння пытання транспартных зносін паміж вёскамі Прусы і Краснадворцы даччынае ўнітарнае прадпрыемства «Аўтобусны парк №1» з 17 лістапада адкрывае маршрут «Салігорск — Чэпелі» праз вёскі Краснадворцы, Крывічы, Касынічы, Балотчыцы, Прусы. Час адпраўлення ад аўтавакзала «Салігорск» — 8.25 і 16.30 па серадах. Інфармацыя для пасажыраў пра новы маршрут «Салігорск — Чэпелі» будзе размешчаная ў сродках масавай інфармацыі, на аўтавакзале «Салігорск», у сельскіх выканкамах».

Не абышлі ў адказе і ўзнятыя чытачом пытанні наконт культурнага жыцця вяскоўцаў. «Прускі сельскі клуб быў зачынены па рашэнні Салігорскага раённага выканаўчага камітэта па прычыне 100-працэнтнага зносу будынка і немагчымасці яго далейшай эксплуатацыі.

У сувязі з закрыццём клуба зараз культурным абслугоўваннем жыхароў займаецца перасоўная ўстанова культуры — аўтаклуб, які штомесяц, згодна з зацверджаным планам, наведвае жыхароў маланаселеных і аддаленых пунктаў раёна. Апошнія канцэрты для жыхароў вёскі Прусы канцэртнай брыгадай былі дадзеныя 21 жніўня і 12 лістапада, наступны пройдзе ў снежні».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ШОСТЫ рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», фінал якога прайшоў сёлета ў раённым цэнтры Акцябрскі, звонкім рэхам адгукнуўся ў Мінску. Музыкі, спевакі, танцоры з розных гарадоў і вёсак Беларусі прыехалі ў сталічны Палац культуры чугуначнікаў, каб парадаваць сваімі талентамі мінскіх аматараў фальклорнага мастацтва. Называць іх самадзейнымі артыстамі нельга, бо іх творчасць грунтуецца не на канонах сцэнічнага мастацтва, а на захаванай з мінулага спадчыне. Гэтая багатая спадчына, перанятая маладымі выканаўцамі, працягвае захапляць сваёй прыгажосцю.**

2

1

# «ЗВЯЗДА» Ў КАРАГОДЗЕ «БЕРАГІНІ»

3

4

**АЛЕ не толькі моладзь выступала тут — на сцэну выходзілі таксама фальклорныя гурты людзей сталага веку. Звонка выводзілі бабулі і дзядулі вясельныя песні, спрытна вадзілі абрадавы карагод. У фае Палаца сваё майстэрства паказвала дзятва: там можна было паглядзець, як малыя навучыліся ад старэйшых плесці паясы, рэзаць выцінанкі, рабіць з жытнёвай саломкі лялькі.**

**Трэба дадаць, што фальклорны фэст быў «падмацаваны» вельмі грунтоўнымі выступленнямі навукоўцаў і практыкаў, якія правялі тут «круглы стол» на тэму «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання, аднаўлення і трансляцыі».**

**Прысутнічала на гэтай прэзентацыі фестывалю і газета «Звязда». Вось ужо шмат гадоў наша выданне з'яўляецца інфармацыйным спонсарам «Берагіні» — расказвае, як у гарадскіх і вясковых школах далучаюць дзятву да фальклорнай спадчыны, як гэта станоўча ўплывае на фарміраванне светапогляду школьнікаў. А таксама інфармуе чытачоў пра самыя яскравыя відовішчы — фінальныя імпрэзы, якія праходзяць раз у два гады. У фае Палаца была разгорнутая вялікая «звяздоўская» фотавыстава — на здымках гледачы пазнавалі маленькіх і дарослых удзельнікаў прэзентацыі, бачылі іх мінулыя выступленні. Гэта фотавыстава з Мінска пераедзе на радзіму фестывалю ў райцэнтр Акцябрскі, дзе далучыцца да ўжо створанага там нашай газетай фоталетапісу «Берагіні».**

**Здымкі гэтага фотарэпартажу прадстаўляюць адну з работ «звяздоўскай» выставы і знаёмяць з удзельнікамі фэсту, якія прыехалі ў Мінск з Акцябрскага раёна.**

**1.** Малады майстар Акцябрскага дома рамёстваў Марына Раговіч знаёміла гледачоў з калекцыяй лялек, апранутых у мясцовыя строі.

**2.** Купальскі карагод «Берагіні»

**3.** Удзельніца фальклорнага гурта «Перазвоны» Надзея Кароль і кіраўнік хору ветэранаў Васіль Багдановіч.

**4.** Наталля Уладзіміраўна Малаковіч і яе дзеці Ганна і Яраслаў выдатна выступілі ў паказах многіх відаў творчасці.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

## Мінскае «Дынама» атрымала ў гасцях перамогу над лідарам чэмпіянату КХЛ

**На гэты раз дынамаўцы «разабраліся» з магнітагорскім «Металургам» — 4:3 — у пасляматчавай серыі булітаў. Асноўны і дадатковы час закончыўся ўнічыю — 3:3.**

Ужо на другой хвіліне матча вызначыўся Дзмітрый Мялешка, які дабіў шайбу ў вароты пасля кідка Сяргея Дзямагіна. У сярэдзіне другога перыяду зноў жа Мялешка забіў гол з перадачы чэха Петара Сікоры. У канцы гэтай дваццацімінуткі гаспадары змаглі адквітаць адну шайбу. На пачатку завяршальнай трэці матча Мялешка аформіў хет-трык, але перавагу мінчанам утрымаць не ўдалося: на 48-й хвіліне на працягу 30 секунд вызначаліся гаспадары пляцоўкі — іх легіянеры Томаш Ралінек і Энвер Лісін зраўнялі лік, які не змяніўся і ў авертайме.

У серыі булітаў больш удачлівымі былі мінчане, за якіх закідвалі Дзмітрый Мялешка і Петар Сікора. У «Магніткі» вызначыўся толькі Аляксей Кайгародаў.

Галоўны трэнер мінчан, чэшскі спецыяліст Марак Сікора, быў задаволены вынікам сустрэчы:

— Гульня нам удалася, асабліва ў абароне, за выключэннем, вядома, адной хвіліны, калі мы прапусцілі двойчы. Тым не менш, прывезці з Магнітагорска два вачкі — гэта поспех. Хет-трык у выкананні Мялешкі мяне не здзівіў. Ён стараецца, і гэтыя тры закінутыя шайбы — узнагарода за ўпартую працу. І не забывайце, што ён удала выканаў і буліт, гэта таксама важна. Выпішу яму бонус!

Нагадаем, што завяршальны матч гэтага выязнога турнэ «Дынама» правядзе сёння ў Мыцішчах супраць «Атланта».

**Кар. «Звязды».**

Считать недействительным страховой полис серии БК № 0055543 Договор страхования, заключенный с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом (Форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни. *УНП 200035955*

Утерянный бланк строгой отчетности 1СУо «Квитанция о приеме наличных денежных средств по обязательному страхованию строений, принадлежащих гражданам» серии КО, в количестве 1 штука № 0822320 Представительства Белгосстраха по Дзержинскому району считать недействительным. *УНП 600013344*

Культнавіны

# ВЯРТАННЕ ІНБЕЛКУЛЬТА

**З першага снежня пачне працаваць Інстытут культуры Беларусі, пра гэта паведаміў намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі на адкрыцці Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Нацыянальная культура і мастацтва Беларусі ў Еўрапейскім кантэксце».**

«Калі мы задумваліся аб яго мэтах і задачах, безумоўна, звярталіся да гісторыі Інбелкульта, які быў створаны ў 1922 годзе, і практычна на базе якога была створана Нацыянальная акадэмія навук. Мы прыйшлі да думкі: чаму б не аднавіць і назву? У скарочанай назве новы інстытут так і гучыць: «Інбелкульт», тым самым мы падкрэсліваем, што Інстытут культуры павінен грунтавацца на гістарычных традыцыях, якія былі закладзены нашымі папярэднікамі», — расказаў Тадэвуш Іванавіч.

Таксама спадар Стружэцкі заўважыў, што зараз ва ўрадзе знаходзіцца дзяржаўная праграма «Культура Беларусі», якая разлічана на 2011—2015 гады. «Спадзяёмся, што яе рэалізацыя будзе важным крокам не толькі для павышэння ролі культуры, але і ў цэлым культурнай кансалідацыі грамадства. Спрыяць таксама больш шырокаму ўкараненню нашай роднай беларускай мовы не толькі ў сферы культуры, але ў жыцці грамадства».

Па словах намесніка міністра культуры, 16 снежня адбудзецца знакавая падзея — адкрыццё замкавага комплексу Мір. Шматгадовая праца па аднаўленні гэтага помніка закончваецца. А ў наступным годзе пачне працаваць і яшчэ адзін культурнаасветніцкі цэнтр — будуць закончаны працы на палацавым комплексе ў Нясвіжы.

Але не толькі тым, што аднаўляюцца помнікі гісторыі і культуры, сёння можа пахваліцца Беларусь. «За апошнія гады ў параўнанні з іншымі нам удалося максімальна поўна захаваць сетку ўстаноў культуры і мастацтва, — заўважыў Тадэвуш Стружэцкі. — За гэты час не страчана ніводнага музея, ніводнага тэатра, нязначна скарацілася сетка клубных устаноў, бібліятэк, на што былі суб'ектыўныя прычыны».

### Сустрэча вучоных

На міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Нацыянальная культура і мастацтва Беларусі ў еўрапейскім кантэксце» ў Мінску сабраліся вучоныя з краін Прыбалтыкі, Расійскай Федэрацыі, Украіны, усіх рэгіёнаў Беларусі.

Беларускім вучоным ёсць чым пахваліцца. Сярод найбольш буйных работ Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі вылучаецца завершанае шасцітомнае выданне «Архітэктура Беларусі. Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце», аналагаў такой працы пакуль няма ва Усходняй Еўропе. Убачылі свет 8 кніг «Гісторыя гарадоў і вёсак Беларусі» (усяго такіх кніг будзе 16, і ў іх змесціцца інфармацыя больш чым пра 24 тысячы населеных пунктаў нашай краіны). Выдадзены новыя тамы па славянскіх этнакультурных традыцыях, музычным мастацтве і кіно ў межах шматтомнага выдання «Беларусы» (серыя адзначаная прэміяй «За духоўнае адраджэнне»).

— Па замове Міністэрства спорту і турызму распрацаваны праект стварэння 52 лакальных турысцка-рэакрацыйных зонаў, падрыхтавана выданне атласа «Турысцкая мазаіка Беларусі», — распавядае дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Аляксандр Лакотка. — Інстытут браў удзел у буйной праектнай тэме «Карэкціроўка генеральнага плана Мінска», у спіс гісторыка-культурнай спадчыны ўключаны гарадабудаўнічыя ансамблі сталіцы 40-60-ых гадоў XX стагоддзя.

### Віртуальнае вяртанне спадчыны

Адной з праграм па захаванні дакументальнай спадчыны праграма «Памяць свету», якую ЮНЕСКА заснавала ў 1992 годзе. Летась архівы нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў былі ўключаныя ў сусветны рэестр. Вялася праца не толькі з архівамі і бібліятэкамі нашай краіны, але з Літвой, Польшчай, Расійскай Федэрацыяй, Украінай і Фінляндыяй, дзе таксама захоўваліся часткі аднаго з буйнейшых кніжных збораў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. У дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі знаходзіцца толькі 20 тысяч з 90 тысяч спраў нясвіжскага архіва, а ў мінскіх бібліятэках — некалькі тысяч кніг з той калекцыі, якая некалі захоўвалася ў Нясвіжы.

У нашу краіну ў электронным выглядзе вернуты архіў Міхала Клеафаса Агінскага. Зроблены вопіс бібліятэкі Храптовіча, распачата работа па праекце віртуальнай рэканструкцыі архіва і бібліятэкі Сапегаў, музеефікацыі Гальшанскага культурнага ландшафту, пачата праца над каталогам «Калекцыя аўтографаў Янкі Купалы». Гэтыя праекты ажыццяўляюцца пры кансультатыўнай, экспертнай і фінансавай падтрымцы ЮНЕСКА.

Як бачыце, дзякуючы выкарыстанню сучасных інфармацыйных тэхналогій, нацыянальныя гісторыка-культурныя каштоўнасці вяртаюцца ў Беларусь, няхай пакуль толькі ў віртуальным выглядзе.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Электаральны аналіз

# ВЫБАРШЧЫК ПАДКАВАНЫ

## З ПАПЯРЭДНІХ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ УЗРОВЕНЬ ЭЛЕКТАРАЛЬНАЙ ДАСВЕДЧАНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ ЎДВАЯ

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 лістапада.)***

**Працяг размовы з дырэктарам Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, доктарам сацыялагічных навук, прафесарам Давідам РОТМАНАМ.**

***— А Вы не схільныя прыпісваць такі поспех актыўнасці і яркасці сёлетніх патэнцыйных кандыдатаў?***

— Так, і «падпісная» кампанія сёлета больш прыкметная — пікеты ў пераходах і ля цэнтральных крамаў, раней такой актыўнасці не было. Прэтэндэнты спрабуюць арыгінальнічаць, і людзі іх заўважаюць. Аднак не заўсёды гэта выклікае адназначна станоўчае стаўленне выбаршчыкаў. Можна і бутэрброды з ікрой раздаваць, толькі не ў кожным выпадку такія прыёмы спрацоўваюць так, як хацелася б іх выканаўцам. Бывае і адваротная рэакцыя. Я ўсё ж такі думаю, прычына ў тым, што людзі самі па сабе развіваюцца, растуць і краіна праходзіць нейкія гістарычныя этапы развіцця. Вось гэта дае аб сабе ведаць. Адбыліся рэальныя змены ў электаральнай сістэме. З'явілася значна большая колькасць людзей, якія могуць выйсці на двор, паставіць тумбу, збіраць за сябе подпісы — значыць, многія сталі больш давяраць новым магчымасцям, якія з'явіліся на сучасным этапе развіцця краіны, верыць у тое, што больш інтэнсіўнымі сталі працэсы дэмакратызацыі. І гэта, безумоўна, стымулюе інтарэс. Я быў вельмі здзіўлены, калі ў вагоне метро пачуў, пра што людзі гутараць. Двое мужчын гаварылі пра паляванне, а пасля раптам адзін у другога пытаецца: «А ты ўжо ведаеш, за каго галасаваць будзеш?». Побач жанчына, якую, заўважыце, наогул ніхто не пытаў: «Вось і я ўжо даўно думаю, здаецца, вырашыла». А той мужчына, у якога пыталіся: «Я пакуль не, пашукаю яшчэ ў інтэрнэце». Бачыце, што творыцца? Раней жа ў многіх выбар быў літаральна несвядомым.

***— Што электарат прагне ўбачыць у праграмах кандыдатаў?***

— Ва ўсім свеце людзі перш за ўсё чакаюць, што няўхільна будзе паляпшацца іх жыццё і матэрыяльны дабрабыт. І вось наколькі пераканаўча кандыдат зможа гэта паабяцаць (а праграма і ёсць абяцанне), настолькі і павысяцца яго шанцы. Паводле ацэнак насельніцтва, эканамічная сітуацыя цяпер якраз стала паляпшацца, няхай і марудна: стыпендыі, заробкі і пенсіі паднялі. Людзей, якія адзначаюць, што іх матэрыяльнае становішча палепшылася, ужо на 5 — 8% больш, чым на папярэдніх выбарах. Прытым колькасць незадаволеных зніжаецца.

***— Не задавольвае, бадай, маруднасць усіх зрухаў...***

— Не так гэта і дрэнна, як падаецца. Я бачу вельмі шмат праблем у тых краінах СНД, якія вельмі хутка перайшлі да дэмакратыі. Маісей жа нездарма вадзіў іудзеяў па пустыні 40 гадоў, каб вытравіць пачуццё раба. Да многіх рэчаў у жыцці трэба пераходзіць паступова, эвалюцыйным шляхам. Інакш узнікае небяспека анархіі. Спачатку паляпшацца ўзровень жыцця, пасля пачынаюцца дэмакратычныя пераўтварэнні. У мяне такое адчуванне, што ў нашай краіне гэтыя паступовыя трансфармацыі пакрысе адбываюцца: людзі сталі больш думаць над выбарам, змяняецца свядомасць, стаўленне да дзяржавы, разуменне ролі людзей, якія ёй кіруюць, у забеспячэнні суверэнітэту краіны. Усведамленне ўласнай ролі, нарэшце.

***— Як думаеце, падзеляць Вашы адчуванні заходнія назіральнікі?***

— Ва ўсякім разе вельмі хочацца спадзявацца! Верыць, што ацэняць аб'ектыўна, як ёсць на самай справе. І ёсць адчуванне, што з боку верхніх эшалонаў улады будзе зроблена ўсё для таго, каб выбары былі справядлівымі, адкрытымі і транспарэнтнымі. А з усяго свету заявы чуюцца розныя. Польскі міністр замежных спраў, напрыклад, падчас свайго візіту ў Мінск падкрэсліў: важны не вынік выбараў, а якасць іх правядзення. Каб усе прынцыпы і стандарты выконваліся. Вядома ж, будуць і спробы загадзя ачарніць вынікі: маўляў, у Беларусі дэмакратычныя выбары немагчымыя ў прынцыпе. Вельмі дзіўныя заявы! Таму што ёсць іншыя дзяржавы на постсавецкай прасторы, дзе палітычная сітуацыя па-рознаму можа быць ацэненая, але там выбары без усялякіх праблем прызнаюцца.

***— Кандыдатаў зарэгіструюць, і пачынаецца самае цікавае — агітацыя. Мяркуеце, яна будзе яркай — з прафесійнымі «трукамі» паліттэхнолагаў?***

— Не бяруся прагназаваць, бо пакуль, мне падаецца, да прафесіяналаў прэтэндэнты не звярталіся. Інакш як растлумачыць некаторыя заявы асобных удзельнікаў?! Яны так ударяюць па іх іміджу, што я проста не магу ўявіць, каб прафесіянал такое параіў. Думаю, выбаршчыкам варта зазіраць час ад часу на іх сайты, сачыць за іх выказваннямі і ўсё ўзважваць. Дэбаты, якіх у нашай краіне не было ажно з 1994 года, вядома ж, могуць пасадзейнічаць падагрэву інтарэсу да выбараў. Праўда, толькі ў тым выпадку, калі ўдзельнікі будуць умець іх весці. Вядома ж, будуць нейкія спробы уздзейнічаць і сацыялагічнай інфармацыяй. Не ўсім апублікаваным вынікам можна давяраць. Вы ж не будзеце купляць падазроны ёгурт, на якім не напісаны вытворца і тэрмін прыгоднасці. Так і з сацыялагічным даследаваннем: павінна быць напісана, хто праводзіў замеры, колькі чалавек апытана, якая выбарка і так далей — гэткі міні-пашпарт даследавання. Ведаю выпадкі падчас мінулых прэзідэнцкіх выбараў, калі ўвечары пасля галасавання тэлефанавалі ў кватэры: «Мы праводзім экзіт-пол. Скажыце, калі ласка, за каго вы галасавалі?». Поўная прафанацыя. Падобныя апытанні праводзяцца толькі на выхадзе з участка, а ніяк не па тэлефоне. У інтэрв'юераў павінен быць бэдж з інфармацыяй пра сябе і тую сацыялагічную службу, на якую ён працуе. Так што галоўная парада ўсім на гэтых выбарах — будзьце пільныя, не дайце сябе падмануць!

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

Утерянные бланки строгой отчетности «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь (комплексное)» серии КС, в количестве 5 штук с № 279996 по № 280000, «Добровольное страхование ГО и расходов граждан, имеющих право пользования жилыми помещениями» серии БГ, в количестве 3 штук с № 53928 по № 53930 Представительства Белгосстраха по Несвижскому району считать недействительными. *УНП 600013344*

## МОПСЫ Ў ВЯЧЭРНІХ СТРОЯХ, МАЙНКУНЫ — У КАМІЗЭЛЬКАХ

Самая вялікая ў краіне шоу-выстаўка пародзістых сабак і кошак «Зааэкспа-2010» прайшла ў Мінску. На галоўным рынгу выставачнага комплексу на працягу двух дзён — 20 і 21 лістапада — наведнікі выставы змаглі паназіраць за выступленнямі лепшых сабак — прызёраў чэмпіянатаў свету, напрыклад, у катэгорыі фрыстайл (танцы з сабакамі) ці аджыліці (пераадоленне перашкод). Свае самыя лепшыя строі прадэманстраваць на касцюміраваным шоу адважыўся не адзін дзясятак сабак розных парод. Таксама на выставе была прадстаўлена вялікая колькасць пародзістых катоў, наведнікі маглі не толькі пазнаёміцца з дамашнімі ўлюбёнцамі, але і набыць кацяня з «пашпартам» альбо прыглядзецца да будучага члена сям'і.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 29 декабря 2010 года проводит 16-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/ наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
| 7 | Речицкое шоссе, в районе жилых домов № 119 и № 129 | 340100000006004321 | 0,1821 | здания магазина и кафе | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0104 га; охранная зона канализации, водовода, электрокабеля – 0,0298 га. | 30 | 1 423 309 | 74 479 879 | 7 447 900 |
| 8 | 8-й пер. Ильича | 340100000007005669 | 0,2804 | зданий складского и административно-бытового назначения | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 50 | 3 806 826 | 86 876 647 | 8 687 600 |
| 9 | ул. Войсковая (бывшая территория воинской части) | 340100000006004287 | 0,3330 | здания специализированного складов | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 50 | 2 448 341 | 136 510 201 | 13 651 000 |
| 10 | пр-зд Орудийный (участок № 1) | 340100000007004921 | 0,5381 | объектов экологически чистого производства | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0128 га. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 20 | 587 480 | 69 399 094 | 6 939 900 |
| 11 | Речицкое шоссе (в районе котельной и жилого дома № 27) | 340100000006004172 | 0,0137 | размещения павильона по оказанию услуг населению | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализации, теплотрассы, электрокабеля – 0,0048 га. | 10 | 1 545 604 | 4 161 519 | 416 100 |
| 12 | ул. Добрушская (станция техобслуживания) | 340100000008001613 | 0,4505 | станции техобслуживания | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0168 га; водопровода – 0,0163 га. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. | 20 | 2 532 588 | 87 694 124 | 8 769 400 |
| 13 | ул. Дорожная (в районе пешеходного моста) | 340100000008001760 | 0,0790 | павильона по оказанию услуг населению (резка стекла). | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи и водопровода – 0,0227 га. | 5 | 923 705 | 15 084 681 | 1 508 400 |
| 14 | ул. Головацкого, конечная остановка «Мельников луг» | 340100000001004437 | 0,0065 | остановочного павильона общественного транспорта (с установкой торгового павильона в составе остановочного комплекса) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона ливневой канализации 0,0001 га. | 5 | 863 461 | 1 364 883 | 136 400 |
| 15 | ул. Мазурова в микрорайоне № 19 (участок № 1 и участок № 2) | 340100000001004200 340100000001004201 | 0,1189 0,0377 | оздоровительного центра (медицинские услуги, парикмахерская, фотоуслуги, ателье, цветочный магазин) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: участок № 1 – охранная зона канализации – 0,0038 га, охранная зона подземной кабельной линии связи, подземной кабельной линии электропередачи – 0,0196; участок № 2 – охранная зона канализации – 0,0041 га | 50 | 624 661 | 149 165 750 | 14 916 500 |
| 16 | ул. Чечерская (микрорайон № 21) | 340100000002004625 | 0,0305 | здания специализированного здравоохранения и предоставления социальных услуг (аптека) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона теплотрассы – 0,0040 га. | 30 | 1 020 365 | 14 956 660 | 1 495 600 |
| 17 | ул. Чечерская (микрорайон № 21) | 340100000001004505 | 0,0498 | здания специализированного для обслуживания населения (парикмахерская, мастерская) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Земель с ограничением в использовании нет. | 50 | 1 113 210 | 37 105 753 | 3 710 500 |
| 18 | ул. Текстильная | 340100000003001800 | 0,6789 | здания многофункционального назначения (станция техобслуживания, салон автомобилей, офисный центр, торговый центр с промышленной группой товаров) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона подземной кабельной линии электропередачи – 0,1460 га; охранная зона водовода – 0,0310 га. Выполнить технические условия по выноске КЛ и водовода. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. | 30 | 581 818 | 375 030 402 | 3 750 300 |
| 19 | ул.Лепешинского – проезд Инженерный | 340100000002002626 | 0,1639 | производственной базы | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничение в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ – 0,0970 га. | 30 | 1 194 160 | 36 567 677 | 3 656 700 |
| 20 | ул. Мазурова | 340100000001003288 | 2,7581 | культурно-развлекательного оздоровительного центра «Аквапарк» | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона газопровода и водоохранная зона оз. Бурое Болото – 0,0811 га; водоохранная зона оз. Бурое Болото – 1,7335 га; прибрежная полоса оз. Бурое Болото – 0,9435 га. | 30 | 2 441 250 | 1 215 491 893 | 121 549 100 |
| 21 | ул. Севастопольская | 340100000007005754 | 0,0970 | специализированного здания розничной торговли непродовольственными товарами | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи, электрокабеля, водопровода, теплотрассы – 0,0264 га. | 30 | 2 658 806 | 60 107 938 | 6 010 700 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 24 декабря 2010 г. в 12.00** в Гомельском городском исполнитель

> МЫ ПАЭТАПНА НАРОШЧВАЕМ АБАРОТЫ, КАБ ДА МОМАНТУ ЗАПУСКУ ВІДЭАСІСТЭМЫ НА ПОЎНУЮ МАГУТНАСЦЬ ЯНА ФУНКЦЫЯНАВАЛА ЭФЕКТЫЎНА І НЕ ДАВАЛА ЗБОЯЎ. КАБ НЕ ПАСТУПАЛА СКАРГАЎ АД ГРАМАДЗЯН, А ТАКСАМА З БОКУ АВАРЫЙНЫХ, ВЫРАТАВАЛЬНЫХ І МЕДЫЦЫНСКІХ СЛУЖБАЎ, ЯКІЯ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ СВАЮ ДЗЕЙНАСЦЬ.

# РАДАР

ВЫПУСК № 11 (15)

**Спецпраект газеты «Звязда» і Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь**

> З МУЖЧЫНАМІ, МНЕ ЗДАЕЦЦА, ЛЯГЧЭЙ, ЧЫМ З ЖАНЧЫНАМІ. НА ПРАЦЫ АДСУТНІЧАЮЦЬ ДОЎГІЯ БЫТАВЫЯ РАЗМОВЫ. НІКОЛІ МУЖЧЫНЫ НЕ АДМАЎЛЯЮЦЬ У ДАПАМОЗЕ І РОБЯЦЬ ГЭТА КУДЫ ХУТЧЭЙ.

## А ў нас...

У Барысаве прайшла акцыя, прысвечаная тыдню памяці ахвяр ДТЗ. Цікава што непасрэдны ўдзел ў акцыі прынялі самі кіроўцы.

— Сэнс акцыі ў тым, што на пэўных вуліцах горада, на святлафорах, выездах з горада кіроўцы спыняюцца і сігналяць, — расказаў «Звяздзе» **начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Мінаблвыканкама Алег ЦЮРЫН**. — Сігналяць цэлую хвіліну, выражаюць такім чынам сваю салідарнасць, свой жаль аб ахвярах ДТЗ. Звяртаюць увагу на акцыю і пешаходы, спыняюцца і таксама аддаюць даніну памяці.

Падобныя акцыі на працягу тыдня плануюцца адбыцца і ў іншых буйных гарадах Міншчыны (Салігорску, Слуцку, Барысаве, Маладзечне і г.д).

❑

**У Магілёве да Сусветнага дня памяці ахвяр ДТЗ вучні ўсіх школ горада сваімі рукамі падрыхтавалі адмысловыя паштоўкі для кіроўцаў, а таксама напісалі ім лісты.**

**— Напісалі дзеці вельмі моцна і душэўна, — гаворыць начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Вікторыя ЖЭЎНЕР. — У выніку з кожнай школы было адабрана па 10 лепшых паштовак, якія інспектары ДАІ сумесна з валанцёрамі Чырвонага Крыжа будуць раздаваць кіроўцам на вуліцах горада.**

**Разумеючы важнасць і актуальнасць усіх пытанняў, што датычацца захавання нормаў Правілаў дарожнага руху, культуры ваджэння і пераходу вуліц, мы вырашылі ў кожным спецвыпуску «Радара» друкаваць найбольш актуальныя пытанні, якія хвалююць усіх удзельнікаў дарожнага руху, і адказы на іх пад рубрыкай «КАМПЕТЭНТНА». Спадзяёмся, што такі захад дазволіць нашым падпісчыкам, чытачам і ўсім, хто з'яўляецца ўдзельнікам дарожнага руху, быць у курсе найбольш важных падзей, якія тычацца кожнага з нас.**

### Сёння на пытанні адказвае намеснік начальніка УДАІ МУС Рэспублікі Беларусь Максім Міхайлавіч ПАДБЯРЭЗКІН.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***— У бліжэйшы час (да сакавіка 2011 года) для выезду за мяжу неабходна будзе мець вадзіцельскія правы новага ўзору. Ці плануецца УДАІ МУС РБ арганізаваная замена «старога» вадзіцельскага пасведчання на новае, і наколькі актыўна ідзе такая замена ў цяперашні час?***

— Вадзіцельскія пасведчанні новага ўзору ў Беларусі пачнуць выдаваць не раней як у студзені 2011 года. Аднак усе правы існуючага ўзору будуць сапраўдныя на тэрыторыі нашай краіны на працягу ўсяго тэрміну іх дзеяння і могуць быць заменены на новыя толькі па добраахвотным жаданні іх уладальніка.

29 сакавіка 2011 года ўваходзяць у сілу папраўкі да Канвенцыі аб дарожным руху 1968 года, згодна з чым і распрацавалі нацыянальнае вадзіцельскае пасведчанне новага ўзору. Усё неабходнае для яго выпуску ўжо ёсць. Новае пасведчанне будзе цалкам адпавядаць патрабаванням, што прад'яўляюцца, і прадугледжваць 11 вадзіцельскіх катэгорый і падкатэгорый (АМ — мапед, А і А1 — матацыклы аб'ёмам да і звыш 500 кубічных сантыметраў, B, C, D, BE, CE, DE, F, I). Пры гэтым вадзіцельскае пасведчанне будзе сур'ёзна абароненае. Падрабіць яго практычна немагчыма. Новае вадзіцельскае пасведчанне прадугледжвае наяўнасць асабістага подпісу грамадзяніна, утрымлівае тэкст на беларускай, рускай і англійскай мовах.

Для таго, каб замяніць старыя правы на вадзіцельскае пасведчанне новага ўзору, дастаткова будзе звярнуцца ў падраздзяленне ДАІ, якое адказвае за яго выдачу, з адпаведнай заявай. Трэба таксама прадаставіць старое вадзіцельскае пасведчанне, пашпарт, медыцынскую даведку і квітанцыю аб плаце пошліны.

***— Цяпер на «алімпійскай» трасе Мінск — Брэст устаноўленыя два дзясяткі камер відэафіксацыі. Зразумела, што прыборы «штрафуюць» усіх, хто парушае хуткасны рэжым. Ці маецца ў ДАІ нумарная база транспарту (ДПС, «хуткай дапамогі», МНС і іншых аўтамабіляў), для якіх не прадугледжаныя санкцыі? Калі так, то як вызначаецца праўдзівасць парушэння? У Расіі, як вядома, вельмі шмат праблем у ГІБДД і ўладальнікаў спецтранспарту.***

— У цяперашні час існуе і функцыянуе цэнтр апрацоўкі звестак відэафіксацыі парушэнняў правілаў дарожнага руху. База звестак ужо створаная, механізм адладжаны, аднак патрабуецца пэўны час, паколькі сістэма гэта тэхналагічна дастаткова складаная. Мы паэтапна нарошчваем абароты, каб да моманту запуску відэасістэмы на поўную магутнасць яна функцыянавала эфектыўна і не давала збояў. Каб не паступала скаргаў ад грамадзян, а таксама з боку аварыйных, выратавальных і медыцынскіх службаў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць. Таму на этапе распрацоўкі сістэмы і яе падрыхтоўкі да запуску на практыцы намі былі ўлічаныя тыя недапрацоўкі, якія меліся ў Расіі і не толькі... Мы ўпэўненыя, што пазбегнем неабгрунтаваных прэтэнзій у адрас вышэйпералічаных службаў, зразумела, калі яны сапраўды выконвалі свае абавязкі. І ні ў якім разе не паўплываем на аператыўнасць іх рэагавання.

***— Лістапад традыцыйна вызначаецца кароткім светлавым днём, складанымі ўмовамі надвор'я. Лепшая засцярога для пешаходаў у гэты час — наяўнасць у элементах адзення або на сумках, барсетках святлоадбівальных элементаў. Наколькі востра цяпер стаіць праблема «флікерызацыі» насельніцтва і якія крокі прымяняюцца ў гэтым кірунку супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі?***

— Праблема захавання жыцця пешаходаў — самых неабароненых удзельнікаў дарожнага руху — на нашых дарогах заўсёды стаяла востра. Асабліва з надыходам асенне-зімовага перыяду, калі цямнее рана, а ўмовы надвор'я асабліва не радуюць. Усюды супрацоўнікі ДАІ працягваюць актыўную прафілактычную і тлумачальную работу сярод насельніцтва аб неабходнасці выкарыстання святлоадбівальных элементаў. Мы хочам, каб людзі разумелі і добраахвотна клапаціліся пра сваю бяспеку на дарозе. І не варта забываць, што флікеры не панацэя, калі пешаходы адкрыта парушаюць ПДР: перабягаюць праезную частку ў неналежным месцы, выходзяць з-за стаячага транспарту і г.д. Але наяўнасць святлоадбівальных элементаў дазваляе вадзіцелю загадзя (за 400 метраў) убачыць пешахода на дарозе, прыняць меры для зніжэння хуткасці аж да спынення, каб пазбегнуць наезду і цяжкіх наступстваў.

Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

## ВОПЫТ — НА ВАРЦЕ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Развязка дарогі Нясвіж—Клецк, куды яшчэ прымыкае шлях з Гарадзеі, традыцыйна лічыцца «гарачым» участкам нясення службы для работнікаў дзяржаўтаінспекцыі Нясвіжскага аддзялення ДАІ.

Сёння на баявым пасту — дзяржаўтаінспектар, капітан міліцыі Сяргей Фалітар і супрацоўнік ДПС, лейтэнант міліцыі Вячаслаў Кухта, які паказаў журналісту жазлом у бок патэнцыйнага парушальніка хуткаснага рэжыму, які рухаецца з боку раённага цэнтра.

За час работы ў ДАІ, прызнаюцца супрацоўнікі міліцыі, яны на вока могуць вызначыць, чым «дыхае» той ці іншы вадзіцель транспартнага сродку. У кагосьці не ў парадку таварна-транспартныя дакументы на груз, хтосьці рухаецца без дакументаў, нехта пасля бурнай учарашняй бяседы, а хто-ніхто ўвогуле ўжо пазбаўлены правоў ваджэння. Да кожнага парушальніка, зазначаюць вартавыя дарог, падыход асабліві. Галоўнае, каб кожны з вадзіцеляў не застаўся пакрыўджаным ад дзеянняў супрацоўнікаў дзяржаўтаінспекцыі. І тут ужо на дапамогу прыходзіць не толькі адмысловае веданне заканадаўчых дакументаў, але і вялікі жыццёвы вопыт, які дапамагае міліцыянерам прыняць правільнае рашэнне ў любой сітуацыі.

# БЯСПЕКА РУХУ І «ШОКАТЭРАПІЯ»...

**З 15 па 21 лістапада ў Беларусі праходзіў тыдзень бяспекі дарожнага руху, які быў прымеркаваны да Сусветнага дня памяці ахвяр дарожных аварый. Падрыхтоўцы і правядзенню гэтага Дня была прысвечана прэс-канферэнцыя.**

Як паведамілі нашы суразмоўцы, а на сустрэчу з журналістамі прыйшлі намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ МУС Максім Падбярэзкін, яго калегі па рабоце, запланаваны шэраг цікавых мерапрыемстваў і акцый па ўсёй краіне.

Гэты тыдзень бяспекі дарожнага руху адрозніваўся ад іншых такіх падобных па тэматыцы мерапрыемстваў. Сярод іх радыёмост з прадстаўнікамі ДАІ Беларусі, Украіны і Расіі. Гаворка ішла пра павышэнне прафілактыкі дарожна-транспартных здарэнняў у гэтых краінах, таксама адбыўся абмен думкамі і прапановамі. У Віцебску прайшоў аўтапрабег з удзелам членаў мясцовага клуба маладых вадзіцеляў і пры падтрымцы клуба байкераў. У Гродна — акцыя «Прыпынак па патрабаванні». Яе геаграфія — дарогі вобласці. У Гомелі на цэнтральнай плошчы прайшла акцыя «Еўрабачанне». У Мінску бяспеку руху яго ўдзельнікаў забяспечвалі падраздзяленні ДАІ.

У размове з журналістамі Максім Падбярэзкін, у прыватнасці, зазначыў, што нашы дарогі камфортныя і бяспечныя для язды. Але толькі пры адной умове: чалавек за рулём павінен сябе правільна паводзіць, а гэта значыць, бездакорна выконваць правілы дарожнага руху. Гучыць банальна, але іншага спосабу даехаць куды трэба, без прыгод няма.

Сярод асноўных прычын ДТЗ Максім Падбярэзкін вылучае перавышэнне хуткасці, невыкананне правілаў дарожнага руху, ужыванне алкаголю, дрэнны стан транспартных сродкаў. На барацьбу з гэтымі прычынамі ДТЗ пры актыўным удзеле грамадскасці былі накіраваны намаганні супрацоўнікаў ДАІ Беларусі падчас Сусветнага дня памяці. Адной з галоўных задач тыдня бяспекі руху стала дзейнасць па замацаванні тэндэнцыі зніжэння гібелі і траўматызму людзей у аўтамабільных катастрофах, якая назіраецца ўжо другі год запар. Аднак, нягледзячы на гэтыя поспехі, не можа не засмучаць той факт, што на дарогах па-ранейшаму гінуць дзеці. Не вельмі суцяшае, што колькасць такіх здарэнняў апошнім часам скарацілася на трэць. Бо смерць кожнага дзіцяці — вялікая трагедыя для яго сям'і і грамадства. Аналіз трагічных выпадкаў з удзелам дзяцей сведчыць, што часцей гэта адбываецца з-за халатнасці бацькоў, гаворыць Максім Падбярэзкін.

П'янства за рулём — наша даўняя бяда. На фронце барацьбы з ёю ёсць пэўныя станоўчыя вынікі. Тут у значнай меры дапамагло павышэнне адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення. У выніку колькасць ДТЗ па віне такіх асоб значна скарацілася. Адпаведна знізілася і лічба загінулых і параненых у «п'яных» аварыях. У 2009 годзе за язду ў нецвярозым стане затрымана больш за 54 тысячы вадзіцеляў, з іх 5 тысяч — паўторна. За 10 месяцаў гэтага года ўжо затрымана больш за 47 тысяч нецвярозых вадзіцеляў, паўторна — амаль 4 200.

Перавышэнне хуткасці — адна з сур'ёзных праблем забеспячэння бяспекі руху на дарогах краіны. З гэтым злом ДАІ змагаецца і будзе рашуча змагацца надалей. Таксама часта парушаюцца правілы праезду пешаходных пераходаў, правілы манеўравання, што часта бывае выклікана нематываванай агрэсіяй на дарогах.

Так атрымалася, што падчас тыдня прайшоў конкурс дзіцячага «Ёўрабачання». У Мінску бяспеку руху яго ўдзельнікаў забяспечвалі падраздзяленні ДАІ.

У размове з журналістамі Максім Падбярэзкін, у прыватнасці, зазначыў, што нашы дарогі камфортныя і бяспечныя для язды. Але толькі пры адной умове: чалавек за рулём павінен сябе правільна паводзіць, а гэта значыць, бездакорна выконваць правілы дарожнага руху. Гучыць банальна, але іншага спосабу даехаць куды трэба, без прыгод няма.

## А ў нас...

У Брэсце ў межах тыдня памяці, прысвечанага Сусветнаму дню памяці ахвяр ДТЗ, прайшоў малебен у Свята-Мікалаеўскай царкве на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. У набажэнстве, акрамя родных і сваякоў загінулых, прынялі ўдзел супрацоўнікі ДАІ і святары.

— Пасля заканчэння малебна святара мы асвяцілі найбольш небяспечныя ўчасткі дарог у Брэсце, — паведаміў «Звяздзе» **старшы інспектар аддзела агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ЮРАШЭВІЧ**. — У асноўным гэта былі скрыжаванні дарог і пешаходныя пераходы. Ля пераходаў юныя інспектары дарожнага руху раздавалі кіроўцам адмысловыя лісткі па правілах бяспекі на дарогах. Завяршылася акцыя сімвалічна: у неба былі выпушчаны 22 паветраныя шарыкі — 11 чорных (колькасць ахвяр ДТЗ з пачатку года па Брэсце) і 11 белых (як сімвал жыцця).

### Сяргей ТАЛАТАЙ, начальнік Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі:

## «УДЗЕЛЬНІКІ ДАРОЖНАГА РУХУ ПАВІННЫ ПАВАЖАЦЬ АДЗІН ДРУГОГА»

**Неяк ужо прынята лічыць, што беларусы — людзі ў сваёй асноўнай масе законапаслухмяныя, асцярожныя, памяркоўныя. Аднак з кабіны аўтамабіля, ды і вачамі пешахода нярэдка бачыцца зусім іншае — ігнараванне элементарных нормаў знаходжання на дарогах, наплявацельскае стаўленне не толькі да закона, але і да іншых удзельнікаў дарожнага руху. Дык, можа, вышэйзгаданыя ацэнкі ў наш адрас — гэта хутчэй міфы, чым рэалii? З такога пытання карэспандэнт «Звязды» пачаў гутарку з падпалкоўнікам міліцыі Сяргеем ТАЛАТАЕМ, які нядаўна ўзначаліў Дзяржаўтаінспекцыю Гродзенскай вобласці.**

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

— Усё пазнаецца ў параўнанні. Падчас сёлетняга водпуску я, паездзіўшы па дарогах Украіны і Расійскай Федэрацыі, зрабіў выснову, што ментальнасць нашых вадзіцеляў усё ж адпавядае прыведзеным вамі азначэнням нашага нацыянальнага характару. Яны, мяркую, не такія агрэсіўныя, як у шэрагу іншых рэгіёнаў былога СССР, сярод нашых удзельнікаў дарожнага руху больш узаемапавагі. Хаця, мажліва, мы пакуль яшчэ прайграём у параўнанні, дапусцім, з Германіяй.

У сувязі з гэтым Дзяржаўтаінспекцыя робіць упор на фарміраванне ў вадзіцеляў і пешаходаў прававой свядомасці, я сказаў бы, людскасці ў дачыненні адзін да аднаго, узаемапавагі на дарозе. Вадзіцель павінен паважаць як іншага вадзіцеля, так і пешахода. А пешаход, у сваю чаргу, павінен паважаць вадзіцеля. На жаль, не заўсёды так у нас. Але зрухі да лепшага відавочныя.

***— Ці пацвярджаецца гэта статыстыкай дарожна-транспартных здарэнняў?***

— У параўнанні з мінулым годам сёлета на дарогах Гродзенскай вобласці адзначаецца скарачэнне смяротнага траўматызму на 15 працэнтаў. І такая дынаміка назіраецца на працягу апошніх трох-чатырох гадоў. Гэта абсалютна рэальная статыстыка, бо ўзмацняецца ўліковарэгістрацыйная дысцыпліна і ніякіх утойванняў няма — гэта для нас злачынства. І правасвядомасць людзей змяняецца да лепшага. Але аднамомантна тут усяго жаданага не дасягнеш, гэта працэс працяглы.

**— І пачынаць трэба са школы, дзіцячага садка...**

— Так. Дарослых «пераламаць» цяжка — дзяцей трэба вучыць. І найперш — у сям'і. Мы праводзім шмат выхаваўчых акцый у дзіцячых садках, навучальных установах, рыхтуем адпаведныя метадычныя матэрыялы ў дапамогу настаўнікам. Аднак асноўная ячэйка грамадства — сям'я. Ідзе мама з дзіцем за руку — яна ні ў якім выпадку не павінна пераходзіць праезную частку на чырвоны сігнал святлафора. Калі ў свядомасці малога будзе закладзена, што гэта нельга, то ён ніколі і не зробіць.

Атрымліваецца, сям'я не навучыла, школа неабходнай адукацыі не дала, працоўны калектыў на гэтага чалавека таксама неабходнага ўплыву не выпрацаваў. І мы што, нейкім адным дзеяннем па прыцягненні яго да адказнасці, выпісаўшы штраф, нешта зменім? Не, гэта, на мой погляд, утопія.

Адна з прыярытэтных задач мне бачыцца таксама ў тым, каб паламаць стэрэатып, што супрацоўнік ДАІ — гэта толькі «караючы меч». У першую чаргу ён партнёр — для таго, вядома ж, хто хоча стаць партнёрам і робіць адпаведныя крокі насустрач. Мы прыслухоўваемся да іх заўваг, прапаноў, прымаем адпаведныя меры. У прыватнасці, на нашым сайце (www.gaigrodno.by) ёсць асобная старонка начальніка ўпраўлення, якую я адкрываю сваім паролем. Можна задаць пытанне асабіста мне і ніхто больш, калі патрабуецца канфідэнцыяльнасць, не ўбачыць. Акрамя таго, неўзабаве ўстановім вэб-камеру і ў прыёмныя дні можна будзе з любога рэгіёна задаць пытанне з дапамогай скайп-злучэння.

***— Але ж ёсць і, скажам так, «ідэйныя» парушальнікі, якія наўрад ці зменяцца, хіба што пад страхам вельмі суровай кары. Ці дастатковыя меры адміністрацыйнага ўплыву на такіх вадзіцеляў прадугледжаны цяперашнім заканадаўствам?***

— Па шэрагу правапарушэнняў — дастатковыя, па некаторых — не. У прыватнасці, мяркую, для нецвярозых вадзіцеляў варта прадугледзець пажыццёвае пазбаўленне правоў на кіраванне транспартным сродкам. А прапанова такая. На мой погляд, трэба стварыць механізм, які будзе гарантаваць выкананне таго ці іншага віду адміністрацыйнага пакарання. Нават у выпадку непад'ёмнага, так бы мовіць, штрафу. Няма ў чалавека рэальнай магчымасці выплаціць такую суму — заканадаўствам павінны быць прадугледжаны варыянты адпрацоўкі штрафу, мажліва, на сельгаспрадпрыемстве ці ў іншым месцы. Злоснаму неплацельшчыку трэба заблакаваць банкаўскую картку, яму не павінны выдаваць у банку крэдыт. Людзі, якія ўчынілі праварушэнне, павінны дакладна ўсведамляць, што яны ні ў якім разе не пазбегнуць пакарання.

Дарэчы, хачу папярэдзіць вадзіцеляў, што, свядома парушаючы хуткасны рэжым у надзеі на адсутнасць «даішніка», яны цяпер вельмі сур'ёзна рызыкуюць. Практычна ў кожным падраздзяленні ДАІ Гродзеншчыны цяпер ёсць сістэма «Арэна», якая дазваляе ў аўтаматычным рэжыме фіксаваць парушэнні хуткаснага рэжыму. Пры гэтым уласнік транспартнага сродку, калі ім не прынятыя адпаведныя меры па пераафармленні аўтамабіля на іншага вадзіцеля, павінен дакладна ўсведамляць: менавіта ён нясе адказнасць за ўсё, што адбываецца з гэтай машынай.

***— На сайце Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі нядаўна змешчаны рэйтынг аўташкол, выходзячы са здачы курсантамі іспытаў. Якую ж установу па навучанні вадзіцельскаму майстэрству выбраць? І ў чым, на вашу думку, недапрацоўкі ў падрыхтоўцы шафёраў?***

— Усё найперш залежыць ад самога кандыдата ў вадзіцелі. Калі ён хоча атрымаць веды — ён іх атрымае практычна ў любой аўташколе. Іншае пытанне, калі ён прыходзіць не па веды, а па вадзіцельскае пасведчанне. Мяркую таксама, што, на жаль, сённяшняя сістэма падрыхтоўкі вадзіцеляў вучыць чалавека задаваць на правы, а не нормам удзелу ў бяспецы дарожнага руху. Навічкоў практычна не вучаць, як правільна паводзіць сябе ў складаной сітуацыі. Напрыклад, што можа прывесці да бакавога заносу, як з яго выйсці? Якія адметнасці кіравання аўтамабілем у туман, дождж, галалёд, снег?

Мажліва, гэта не спадабаецца некаторым чытачам, але я перакананы, што сістэма падрыхтоўкі вадзіцеляў не павінна быць нейкім канвеерам. Гэта вельмі сур'ёзная сфера нашай жыццядзейнасці. І, галоўнае, чалавек не павінен спачатку атрымаць вадзіцельскае пасведчанне, а потым некалькі гадоў ездзіць па дарогах і вучыцца.

***— А што рабіць з так званай спадчынай мінулага, у прыватнасці, малымі дваравымі тэрыторыямі, недахопам месцаў для паркоўкі транспарту?***

— Гэта пытанне актуальнае не толькі для Гродна, але і ў цэлым для рэспублікі, ды і ўсяго свету. Аўтамабілізацыя насельніцтва ідзе гіперактыўнымі крокамі і тыя праектныя рашэнні, што прымаліся раней, гэтага не прадугледжвалі. І цяпер мы, так бы мовіць, пажынаем плады.

Безумоўна, Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць прафілактычную працу, тлумачыць, напрыклад, што калі аўтамабіль стаіць у неналежным месцы, то гэта можа перашкодзіць транспарту хуткай медыцынскай дапамогі, пажарнай ці жыллёва-камунальнай службы. Але гэта не заўсёды даходзіць да свядомасці вадзіцеляў і таму мы, асабліва ў вельмі праблемных месцах, вымушаны прымаць жорсткія меры. Пры гэтым разумеем, што толькі карнымі санкцыямі праблему не вырашыць. Згодна з праграмамі добраўпарадкавання, праводзіцца рэканструкцыя існуючых дваравых тэрыторый, а пры новым будаўніцтве ДАІ абавязкова ўносіць прапановы па іх пашырэнні.

Але адным махам гэтыя праблемы не вырашыць. Цяпер у Гродне на базе ЖКГ ствараецца служба па эвакуацыі прыпаркаваных з парушэннем правілаў аўтамабіляў, каб навесці парадак у найбольш праблемных месцах, адкуль тэлефануюць літаральна днём і ноччу. Адзін з варыянтаў паляпшэння сітуацыі ў гэтым кірунку — шматузроўневыя стаянкі. Так, іх пакуль не хапае. Але што паказвае практыка? Па маёй інфармацыі, нават ужо існуючыя падобныя стаянкі... не запаўняюцца, бо за гэта трэба плаціць. Таму многія лічаць за лепшае кінуць машыну на газоне каля дома.

***— І толькі адміністрацыйны рэсурс тут, як і на дарогах, не дапаможа...***

— Сапраўды, якія меры пакарання не прымаліся б, усё будзе дарэмна, калі кожны вадзіцель не будзе ўспрымаць сябе членам аўтамабільнага супольніцтва з адпаведнымі этычнымі нормамі, правамі і абавязкамі.

## А ў нас...

У Ленінскім раёне Мінска прайшла другая сумесная акцыя ДАІ і праваслаўнай царквы.

— Адназначна можна сказаць, што на асвячоных годам раней аварыйных участках сталічных дарог аварыйнасць знізілася, — гаворыць **старшы інспектар аддзела агітацыі і прапаганды Ленінскага раёна сталіцы Таццяна КРАСІЙ**. — І што яшчэ больш важна — з моманту асвячэння не загінуў ніводзін чалавек. Магчыма, гэта толькі спрыяльны збег акалічнасцяў, але многія нашы супрацоўнікі так не лічаць.

❑

**Аддзел агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Савецкага раёна сталіцы сумесна з адміністрацыяй СШ № 91 г. Мінска правяла акцыю пад назвай «Нам без флікера, сябры, на дарозе нельга быць!»**

**Як расказаў «Звяздзе» дзяржаўтаінспектар ДАІ Савецкага раёна сталіцы Андрэй ДЗЯРКАЧ, спачатку перад школьнікамі была пастаўлена сцэнка пра ПДР, пасля чаго супрацоўнікамі ДАІ была праведзена міні-гульня па правілах дарожнага руху. Напрыканцы акцыі ўсе дзеці атрымалі ў падарунак флікеры.**

❑

У Гродне днямі завершыцца фінал конкурсу «Прыпынак па патрабаванні». Сумесная акцыя ДАІ горада і «Радыё Гродна» праходзіла пры падтрымцы цэнтра «Еўрашына» ўжо другі год.

— Па вуліцах Гродна курсіравала патрульная машына, у якой поруч з інспектарамі ДАІ быў таксама і дыджэй радыё, — распавяла «Звяздзе» **інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама Іна ТАРАСЕВІЧ**. — У прамым эфіры паведамлялася пра тое, па якой вуліцы мы зараз едзем і які ў нас аўтамабіль. Пасля мы выбіралі машыну, якая ехала перад намі, і ў прамым эфіры пыталіся, ці чуе нас вадзіцель — называлі яго нумарны знак і прасілі пасігналіць. Самае цікавае, што ў большасці выпадкаў кіроўцы сапраўды за рулём слухалі «Радыё Гродна» і сігналілі.

❑

**У Гомелі падчас хакейнага турніру «Кубак Палесся» інспектары ДАІ арганізавалі адмысловую акцыю для балельшчыкаў.**

**— На другім паверсе хакейнага Палаца мы ўключалі мультымедыйную ўстаноўку і запрашалі ахвотных праверыць свае навыкі ПДР, — паведаміла начальнік аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Марыя КРЫВАНОГАВА. — Людзей заўсёды было шмат. Тыя ж, хто спраўляўся з заданнямі, атрымліваў ад ДАІ невялічкія сувеніры — ручкі, каляндарыкі, падстаўкі пад мабільныя тэлефоны.**

## Пра парушэнні бацькоў раскажуць дзеці

**— Хлопчык у дзіцячым садку расказаў аднойчы, як ён ехаў на машыне з бацькам на пярэднім сядзенні, а размова ішла якраз пра тое, у колькі гадоў дзеці могуць сесці побач з кіроўцам, — дзеліцца вопытам сваіх стасункаў з самымі маленькімі ўдзельнікамі дарожнага руху інспектар дарожна-патрульнай службы са Жлобіна Алеся Лаз. — Дзіця гаворыць: а мы з таткам ехалі ў машыне, і калі ён пабачыў міліцыянера, мне сказаў: так, хуценька лажыся!**

**У старшага лейтэнанта Алесі Лаз пакуль яшчэ не вельмі шмат такіх сумна-смешных гісторый пра парушэнні правілаў. Яна крыху больш за год працуе ў ДАІ. Форму апранула крыху раней — працавала з «цяжкімі» няпоўнагадовымі. А першую адукацыю ўвогуле атрымала па спецыяльнасці, зусім не звязанай з міліцыяй — закончыла Віцебскі педінстытут па спецыяльнасці «выкладчык малявання і сусветнай мастацкай культуры». Другая вышэйшая адукацыя ўжо свядомая — юрыдычная. Пры гэтым, гаворыць, людзі, якія носяць форму, заўсёды падабаліся. І цяпер ёй падабаецца, як да яе ставяцца:**

— Слухаю кампліменты, гавораць, што форма вельмі пасуе. Блізкія і сябры адразу зразумелі, калі я змяніла прафесію. Іншыя, калі бачаць жанчыну ў форме, усміхаюцца прыемна. Тут сапраўды творчая работа — калі сустракаешся з дзецьмі, расказваеш ім аб правілах паводзін на дарозе, штосьці паказваеш — працуеш на прафілактыку здарэнняў. Тым больш, даводзіцца час ад часу ездзіць па ўсім Жлобінскім раёне.

***— Наколькі зацікаўлена школьнікі ўспрымаюць інфармацыю аб правілах дарожнага руху?***

— У дзіцячых садках малыя слухаюць вельмі ўважліва, у адрозненне ад старэйшых дзяцей. Вучні пачатковых класаў слухаюць кожнае слова. Са старэйшымі я імкнуся прыцягнуць іх увагу тым, што многія хацелі б у недалёкай будучыні атрымаць пасведчанне кіроўцы і кіраваць сваім аўтамабілем. Імкнуся ставіць іх на месца чалавека за рулём — як бы яны павялі сябе ў той ці іншай сітуацыі. Пасля гэтага яны інакш пачынаюць успрымаць усё тое, што я ім кажу. Усмешкі заканчваюцца і тады, калі расказваю пра здарэнні, што адбываюцца на дарозе, калі не выконваюцца правілы дарожнага руху.

***— Ці былі дзіцячыя пытанні, якія вас ставілі ў тупік?***

— Маленькія пытанняў звычайна не задаюць, а імкнуцца адразу ж расказаць нейкія свае гісторыі з жыцця. Як тая, з якой мы пачалі размову. Калі расказваю пра святлоадбівальныя элементы, імкнуся звярнуць увагу на тое, што флікер павінен быць заўважны, бачны здалёк. Дзеці тут жа пачынаюць дакладаць: мая сястрычка ўвогуле не носіць, а ў маці зусім маленькі флікер. Неяк я трапіла ў садок, дзе выхоўваюцца дзеці маіх калег — супрацоўнікаў міліцыі. Потым яны мне расказваюць: пасля тваёй гутаркі вельмі складана дзіця ў садок весці — прасочыць і яшчэ сам раскажа, як правільна пераходзіць дарогу. Увагу старэйшых школьнікаў можна прыцягнуць толькі канкрэтнымі прыкладамі. Агульныя фразы тут не пройдуць, сухія лічбы статыстыкі — таксама. Іх цяпер хвалюе магчымасць займець скутар, таму старшакласнікі пытаюць пра адказнасць за кіраванне. Калі паказваю ім фільмы — таксама прыслухоўваюцца.

***— Вам даводзілася, напэўна, сустракацца і з цяжкім бокам сваёй справы — здымаць ці пісаць пра здарэнні, у тым ліку з трагічным зыходам.***

— Пакуль не вельмі часта, але некалькі выпадкаў было. Цяжка гэта ўспрымаць. Нават тыя супрацоўнікі ДАІ, якія маюць вялікі вопыт, не стрымліваюцца ў пачуццях і цяжка ўспрымаюць трагедыі на дарозе. Немагчыма заставацца абыякавым. Асабліва, калі гінуць дзеці.

***— У ДАІ вы крыху больш за год — як вы лічыце, чаму ўжо навучыліся?***

— Раней я магла не звяртаць увагі на нейкія моманты на дарозе. Цяпер стала больш уважлівай. Заўсёды раблю заўвагу людзям, калі бачу, што яны парушаюць правілы дарожнага руху. Дзіця абавязкова спыню, калі яно хоча хутчэй перабегчы дарогу, асабліва ў неўстаноўленым месцы. Аднойчы давялося растлумачваць мужчыне з вазком, у якім было немаўля, чаму нельга пераходзіць дарогу ў неўстаноўленым месцы, тым больш ішоў вялізны паток аўтатранспарту. Жудасна, калі бачыш, як бяздумна людзі гатовыя кінуцца на дарогу і не звяртаюць увагі на тое, што навокал. Звычайна мушу нагадваць пра магчымыя наступствы — гэта стрымлівае людзей.

***— Ці цяжка працаваць у мужчынскім калектыве?***

— Атрымалася так, што я спачатку працавала ў выключна жаночым калектыве, потым — у змешаным, а цяпер — у мужчынскім. З мужчынамі, мне здаецца, лягчэй, чым з жанчынамі. На працы адсутнічаюць доўгія бытавыя размовы. Ніколі мужчыны не адмаўляюць у дапамозе і робяць гэта куды хутчэй. Можа, таму, што я тут адна? Зразумела, спачатку было складана, але ж цяпер прывыкла і проста не ўяўляю сябе ў іншым калектыве. Камфортна.

***— Ці актуальная для вас асабіста праблема — жанчына за рулём?***

— Мне здаецца, што жанчыны і за рулём, і ў жыцці больш акуратныя, больш стрыманыя, не так часта трапляюць у дарожна-транспартныя здарэнні, як мужчыны. Сама я зусім нядаўна атрымала пасведчанне кіроўцы — адзіная сярод сваякоў. Аўто пакуль няма, але ж, перш чым сесці за руль, абавязкова скарыстаюся магчымасцю дадаткова павучыцца — каб быць больш упэўненай на дарозе.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Леанід ЛАХМАНЕНКА, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Ілья ЛАПАТО, Барыс ПРАКОПЧЫК.

# «Я паставіў перад мамай умову: КАЛІ ПЕРАМАГУ НА «ЕЎРАБАЧАННІ», ЯНА НАРОДЗІЦЬ МНЕ БРАЦІКА!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Уладзімір АРЗУМАНЯН нарадзіўся ў 1998 годзе ў горадзе Сцепанакерт (Арменія). Спяваць пачаў у шэсць гадоў, калі мама заўважыла яго схільнасць да музыкі (і бацька, і маці ў хлопчыка — выкладчыкі музыкі). Хлопчык выконвае песні на армянскай, рускай і англійскай мовах і марыць праспяваць дуэтам са Стывам УАНДЭРАМ. Сёлета Уладзімір заняў трэцяе месца на конкурсе «Дзіцячая новая хваля», дзе выступаў пад псеўданімам VOV-1. У творчай скарбонцы хлопчыка — дыпломы нацыянальнага армянскага фестывалю «Карот» і фестывалю імя А. БАБАДЖАНЯНА.

**Ілья ЛАПАТО.**

**Выніковая табліца галасавання — першая дзясятка:**

1. **Арменія (120 балаў)**
2. Расія (119 балаў)
3. Сербія (113 балаў)
4. Грузія (109 балаў)
5. **Беларусь (85 балаў)**
6. Літва (67 балаў)
7. Бельгія (61 бал)
8. Малдова (54 балы)
9. Нідэрланды (52 балы)
10. Латвія (51 бал)

Па чутках і кампетэнтна:

## ДЗІЦЯЧАГА «ЕЎРАБАЧАННЯ» БОЛЬШ НЕ БУДЗЕ?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Звычайна пра тое, якая краіна будзе прымаць конкурс налета, вядома ўжо за год. Пра тое, хто прыме ў сябе наступнае дзіцячае «Еўрабачанне», невядома і сёння. Усё часцей ходзяць чуткі пра тое, што конкурс у Мінску быў апошнім конкурсам дзіцячага «Еўрабачання».

— Мы таксама пра гэта чулі, — дзеліцца ўражаннямі з карэспандэнтам «Звязды» бельгіец Патрык Дэ РОК, бацька бельгійскай канкурсанткі Лауры. — Вельмі шкада, калі гэта праўда. Таму што для дзяцей гэты конкурс вельмі важны. Хутчэй за ўсё, Еўрапейскі вяшчальны саюз закрые яго з-за фінансавых прычын.

Выканаўчы прадзюсар дзіцячага «Еўрабачання-2010» Аляксандр МАРТЫНЕНКА яшчэ перад пачаткам конкурсу гаварыў пра тое, што як член назіральнага савета дзіцячага «Еўрабачання», пастараецца зрабіць усё, каб гэтае «Еўрабачанне» было не апошнім.

А вось выканаўчы прадзюсар конкурсаў песні «Еўрабачанне» Свантэ СТАКСЭЛІУС на пастаўленае пытанне канкрэтнага адказу так і не даў, але чуткі абвергнуў:

— Што датычыць правядзення дзіцячага «Еўрабачання» ў наступным годзе, то мы вядзём перамовы з некалькімі краінамі, але пакуль рана казаць пра якуюсьці канкрэтную краіну. Як вызначымся, так і паведамім. Пакуль што вырашаюцца фінансавыя пытанні. Але я дакладна магу сказаць, што дзіцячае «Еўрабачанне» ў Мінску не стане апошнім.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




# Дзіцячае «Еўрабачанне-2011» пройдзе ў Мінску?

**Прагнозы букмекераў рассыпаліся, як дом з пяску. Канкурсантка са Швецыі, якой прадракалі 1-е месца, размясцілася ў выніку на 11-й пазіцыі. А дуэт з Расіі, наадварот, — падняўся на 12 пунктаў, заняўшы другое месца... Увогуле, сёлетні конкурс у многім здзівіў.**

— Склад удзельнікаў у гэтым годзе быў моцным, як ніколі, — гаворыць **музычны кіраўнік Данііла Казлова Нэлі ДУКАВА.** — Конкурс атрымаўся вельмі магутны. І, як педагог, магу сказаць, што Данііл зрабіў усё, што мог і што было запланавана. На сцэне хлопчык выклаўся на ўсе 100 %, я стаўлю яму 10 балаў.

— Падрыхтоўка, якую правяла Белтэлерадыёкампанія, проста ўражвае, яна цудоўная, — гаворыць **выканаўчы прадзюсар конкурсаў песні «Еўрабачанне» Свантэ СТАКСЭЛІУС.** — Вельмі важны момант, што атрымалася сабраць разам усіх пераможцаў мінулых гадоў — гэтага раней ніхто не рабіў. Мы задаволеныя тым, як прайшоў конкурс у Беларусі.

**Конкурс транслявалі ва ўсе чатырнаццаць краін-удзельніц, а таксама Азербайджан і нават Аўстралію. На конкурс было акрэдытавана больш за 200 журналістаў, у тым ліку з Грэцыі і ЗША. Усе канкурсанты, акрамя маленькай копіі галоўнай узнагароды, якая дасталася пераможцу, атрымалі таксама спецыяльныя прызы ЮНІСЕФ. Самае цікавае, што сам фінал адбыўся ў гадавіну прыняцця Канвенцыі аб правах дзіцяці (20 лістапада 1989 года). З 1996-га года гэты дзень святкуюць як Дзень правоў дзіцяці.**

— Усе дзеці на конкурсе выступілі проста цудоўна, — адзначыла **пасол добрай волі ЮНІСЕФ Марыя ГУЛЕГІНА.** — Яны падарылі нам вечар шчырай і непадробленай радасці, якім дарослым трэба толькі павучыцца. Калі вы заўважылі, то пасля аб'яўлення вынікаў на сцэне не было ніводнага сумнага твару, усе проста ззялі.

Заслуга мінскага «Еўрабачання» таксама і ў тым, што яна аднавіла сумесную працу з ЮНІСЕФ.

На рэпетыцыях і самім шоу дзіцячага «Еўрабачання» бясплатна пабывалі каля 1200 дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Грошы, атрыманыя арганізатарамі ад галасавання, будуць пералічаныя ЮНІСЕФ на падтрымку звязаных з гэтай праблемай праграм.

Яшчэ адзін паказальны вынік — пераможца конкурсу Уладзімір Арзуманян музыку і словы да сваёй конкурснай песні «Мама» напісаў сам. Ліза Дрозд і Саша Лазін з Расіі, якія занялі другое месца, таксама самі напісалі сваю песню. Тая ж гісторыя і з уладальніцай трэцяга месца Соняй Скорыч з Сербіі.

Усяго з 14 кампазіцый, прадстаўленых на конкурсе, толькі 5 былі аўтарскімі, гэта значыць напісанымі самімі выканаўцамі. У выніку чатыры кампазіцыі з пяці ўвайшлі ў пяцёрку лідараў — у тым ліку і песня Данііла Казлова «Музыкі святло».

— Калі мы глядзім відэазапіс, слухаем фанаграму — складваецца адно ўражанне, затым дзеці выходзяць на сцэну — і ўражанне змяняецца, — гаворыць **выканаўчы прадзюсар тэлеканала ЛАД Людміла БАРАДЗІНА.** — Тое, што конкурс расце, — гэта безумоўна. Тое, што на конкурсе ёсць малеча — яшчэ лепш. Таму што я вельмі насцярожана адношуся да таго, каб конкурс пасталеў. Не хочацца мне ў ім дарасласці. Я разумею, што дзеці сёння слухаюць розную музыку і капіруюць многае, але мне не хацелася б, каб на сцэну выходзілі — не дарослыя і не дзеці. Хочацца бачыць на сцэне дзяцей!

— Наша песня — пра закаханасць хлопчыка і дзяўчынкі, — падзяліліся **расіяне Ліза ДРОЗД і Саша ЛАЗІН.** — Мы пісалі пра тое, што перажылі асабіста, — пра сяброўства. Гэта песня пра нас.

У нядзелю самалёты з Мінска ўжо везлі ўдзельнікаў конкурсу дадому — на радзіму. Дзяўчынкі з Нідэрландаў, напрыклад, ужо ўчора пайшлі ў школу — пра гэта расказаў тата скрыпачкі Анны Фрэдэрык Лагервай...

Усё часцей ходзяць чуткі пра тое, што наступнае «Еўрабачанне», калі яно ўсё ж такі адбудзецца, мае ўсе шанцы зноў прайсці ў Беларусі. І пакуль прадстаўнікі ЕВС таемна ўсміхаюцца, журналісты ўжо рыхтуюць свае пытанні. Але пажывём — пабачым.

**Ілья ЛАПАТО.**

# Як мужчыны робяць ГЭТА...

## альбо Маўклівае прызнанне

**Мужчыны рэдка дэманструюць свае сапраўдныя пачуцці, нават калі вельмі кахаюць сваю адзіную. Аднак і ў іх ёсць свае спосабы «расказаць» пра трапяткое пачуццё. Толькі не словамі, з-за чаго праўда для жанчын можа быць зусім не відавочнай. І пакуль прыгожы пол чакае букетаў, падарункаў, рамантычных жэстаў і спеваў пад балконам, моцная палова даказвае сваё каханне зусім па-іншаму.**

### 1. ЁН РАСКРЫВАЕЦЦА ПЕРАД ВАМІ.

Расказ пра самыя патаемныя думкі і пачуцці — няпростае выпрабаванне для ўсіх людзей, і асабліва для мужчын. Будзьце ўпэўнены: ён не проста так стаў агаляць перад вамі душу.

### 2. ЁН ВЫКОНВАЕ «БРУДНУЮ» РАБОТУ.

Вынас смецця і чыстка ракавіны — не надта рамантычныя заняткі, аднак гэта мужчынскі спосаб паказаць свой клопат — дапамагчы зрабіць ваша жыццё лягчэйшым.

### 3. ЁН ПРОСІЦЬ ВАС АБ ДАПАМОЗЕ.

Кожны раз, калі ён просіць вас дапамагчы яму выбраць падарунак для мамы, ён хоча пачуць ваша меркаванне, бо ён паважае вас і ваш выбар. Ці ж гэта не прыкмета вялікага кахання?

### 4. ЁН ПРАЯЎЛЯЕ СВАЕ ПАЧУЦЦІ НА ПУБЛІЦЫ.

Калі ён так і імкнецца патрымаць вас за руку, пацалаваць — успрымайце гэтыя дзеянні як камплімент. Ён шчаслівы і ганарыцца тым, што вы — яго жанчына, а часам няма лепшага спосабу выказаць свае пачуцці, чым мацней прыціснуць каханую да сябе.

### 5. ЁН ВЫБІРАЕ ПРАВІЛЬНЫЯ ПАДАРУНКІ.

Калі падарункі, атрыманыя ад яго, не ўяўляюць сабой нечага адметнага — гэта не нагода для хвалявання (большасць мужчын зусім не ўмеюць дарыць тое, што сапраўды патрэбна). А вось калі ён з зайздросным пастаянствам уражвае вас цудоўным выбарам, то можна смела тлумачыць гэта як прыкмету вялікага кахання.

### 6. ЁН ЗНАЁМІЦЬ ВАС З СЯМ'ЁЙ.

Можаце быць упэўнены: як толькі мужчына знаёміць сваю дзяўчыну з мамай, апошняя адразу пачынае намякаць яму на тое, што ёй даўно хочацца стаць бабуляй. Такім чынам, адважыўшыся сабраць за адным сталом дзвюх любімых жанчын, мужчына добра разумее, на што ён «падпісваецца». А значыць, ён бачыць будучыню ў вашых рамантычных адносінах.

### 7. ЁН РОБІЦЬ ВАС ЧАСТКАЙ СВАЙГО КОЛА.

Увесці вас у сваё кола — гэта не толькі назваць вам імёны сваіх сяброў. Калі ён сапраўды будуе планы на будучыню, то будзе планаваць сумесныя паходы ў кіно, вячэры ў рэстаранах, запрашаць вас на мерапрыемствы, якія сталі для яго з сябрамі добрай традыцыяй (наведванне спортпабаў у час важных матчаў, сумесныя прагулкі ў парку, паход у боўлінг і г.д.)

### 8. ЁН СТАНОВІЦЦА ЧАСТКАЙ ВАШАГА ЖЫЦЦЯ.

Калі ён не супраць далучыцца да вас на час нудных (з яго пункту гледжання) паходаў па магазінах ці цярпліва глядзіць з вамі па тэлевізары чарговы «мыльны» серыял, значыць, ён падрыхтаваўся да доўгай асады крэпасці.

### 9. ЁН ІДЗЕ НА КАМПРАМІС.

Усё проста: калі ён кахае вас, то хоча зрабіць вас шчаслівай. Гэта не значыць, што ён заўсёды будзе дазваляць вам рабіць усё, што заўгодна, але ён дакладна гатовы пайсці на кампраміс, які задаволіць абодва бакі. Няважна, пра што ідзе гаворка — пра месца правядзення сумеснага адпачынку, ці пра тое, каму пайсці зачыніць дзверы, — мужчына прадэманструе сваё каханне гатоўнасцю саступіць.

### 10. ЁН ГАВОРЫЦЬ ПРА КАХАННЕ.

Безумоўна, мужчынскае прызнанне ў каханні — падзея настолькі ж рэдкая, як і анекдатычная сустрэча з дыназаўрам, аднак, калі раптам «плаціну прарвала», слухайце, не прапускаючы ні слова (хто ведае, калі яго «накрые» ў наступны раз).

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**

**Открытое акционерное общество «Минский подшипниковый завод»**

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 7 ДЕКАБРЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Повестка дня:**

1. Об утверждении передаточного акта УП «РИПРЭН» ОАО «МПЗ» к открытому акционерному обществу «Минский подшипниковый завод».
2. О внесении изменений в Устав ОАО «МПЗ».

Собрание состоится по месту нахождения общества: г. Минск, ул. Жилуновича, 2, актовый зал ЛБК, начало собрания в 15.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по указанному выше адресу на центральной проходной в кабинете инспектора по жилью ОСБО в период с 03.12.2010 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв с 11.50 до 12.25), в день проведения собрания — по месту проведения собрания.

Регистрация участников с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания по предъявлению документа, удостоверяющего личность.

**Справки по тел. 246 70 31.**

УНП 100151342

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине**

**Организатор аукциона:** Фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. (8017) 224 39 76, (8017) 500 47 10.

**Место проведения аукциона:** г. Минск, ул. Чкалова, 5.

**Дата и время проведения аукциона:** 28 декабря 2010 г. в 12.00.

**На аукционные торги выставляется:**

Часть не завершенного строительством производственного корпуса № 4 в осях 32-34, расположенного по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, д. 31а. Площадь двух пролетов в осях 32-34 – 9 471 кв. м, длина пролетов 156 м, ширина по 30 м, высота крыши 22,8 м. Каркас здания из металлоконструкций. Подкрановые балки сплошного сечения. Кровля здания из легких металлических конструкций типа «Молодечно» из квадратного и прямоугольного гнутосварного замкнутого профиля. Покрытие кровли оцинкованный стальной профильный лист. Стены здания выполнены из каркасных стеновых панелей в комплекте с оконными переплетами двойного остекления. Пол на 60 % площади имеет бетонное покрытие. Начало строительства – 1987 год. Неиспользуемое имущество расположено на земельном участке площадью 1,0301 га, назначение: земельный участок для обслуживания находящегося в государственной собственности капитального строения (части незавершенного строительством производственного корпуса № 4 (оси 32-34). Срок аренды земельного участка – 30 лет.

**Условия использования земельного участка:** победителю аукциона разрешено в установленном порядке использовать земельный участок для размещения объектов производственного назначения.

**Условия аукциона по продаже неиспользуемого имущества:** реализация Инвестиционного проекта создания производства по горячему цинкованию металлоконструкций, в соответствии с которым предполагается создание 110 новых рабочих мест. Осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте в течение 5 лет. Запрещение покупателю продажи, иного отчуждения неиспользуемого имущества до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Начальная цена неиспользуемого имущества составляет** одну базовую величину, определенную законодательством.

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие «Молодечненский завод металлоконструкций» 222310, г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 31а, тел. 8 (0176) 770402, 752401.

**Задаток для участия в аукционе** в размере 35 000 белорусских рублей перечисляется с даты публикации данного извещения по 24 декабря 2010 года на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, ул. Мясникова, 32, код банка 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество».

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312, тел. (8 017) 224 39 76, (8 017) 500 47 10. Начало приема заявлений – 23 ноября 2010 года. Последний день приема заявлений – 24 декабря 2010 года.**

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленных аукционах и предметах аукционов дополнительно размещаются на сайте Минского облисполкома**: www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342.

Участниками аукциона могут быть негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели, которые в установленный в извещении срок должны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Прием заявлений со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения. Информация о названных затратах, порядке и сроках их возмещения в обязательном порядке доводится до сведения участников аукциона до начала проведения аукциона.

**ПОБЕДИТЕЛЬ (ПРЕТЕНДЕНТ НА ПОКУПКУ) ОБЯЗАН:** 1. подписать протокол о результатах аукциона; 2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, в течение 10 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении земельного участка; 3. не позднее двух рабочих дней после совершения участником, выигравшим аукцион (претендентом на покупку), действий, указанных в пункте 2 с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи неиспользуемого имущества, а райисполкомом – договор аренды земельного участка.

## Здарэнне

### Выскачыла казуля...

Каля в. Лесіна, што пад Баранавічамі, на аўтамагістралі Брэст—Мінск казуля выскачыла на «форд-гэлаксі» і ўдарылася аб пярэдняе крыло аўтамашыны.

45-гадовая жанчына-кіроўца ад нечаканасці крутнула ўправа і ўрэзалася ў «газэль», якая рухалася па суседняй паласе.

У выніку «газель» з'ехала ў кювет і перавярнулася, а трое пасажыраў яе апынуліся ў бальніцы. Казуля загінула.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.51 | 16.00 | 8.09 |
| Віцебск — | 7.47 | 15.44 | 7.57 |
| Магілёў — | 7.42 | 15.50 | 8.08 |
| Гомель — | 7.31 | 15.54 | 8.23 |
| Гродна — | 8.05 | 16.16 | 8.11 |
| Брэст — | 7.59 | 16.24 | 8.25 |

### Месяц

***Поўня 21 лістапада.***
***Месяц у сузор'і Блізнятаў.***

### Імяніны

***Пр.*** *Вольгі, Ганны, Аляксандра, Аляксея, Барыса, Георгія, Мікалая, Міхаіла, Пятра.*

***К.*** *Маргарыты, Феліцыты, Клеменса.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## Дзве даты

### 23 лістапада

**1923 год** — створана першае літаратурнае аб'днанне ў Беларусі «Маладняк». Узнікла па ініцыятыве маладых пісьменнікаў А. Александровіча, А. Бабарэкі, А. Вольнага, А. Дудара, Я. Пушчы, М. Чарота пры падтрымцы партыйных і камсамольскіх органаў, Камісарыята народнай асветы. Да іх далучыліся У. Дубоўка, М. Зарэцкі, К. Крапіва, П. Трус, К. Чорны, пісьменнікі старэйшага пакалення З. Бядуля, А. Гурло. Цэнтральнымі друкаванымі органамі былі часопіс «Маладняк», газета «Савецкая Беларусь», многія рэгіянальныя філіялы аддзялення мелі свае выданні. Філіялы, дарэчы, былі не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве, Ленінградзе, Рызе і Празе. У праграмных дакументах Цэнтральнае Бюро «Маладняка» прымала ідэалогію класавай барацьбы і пабудовы камуністычнага грамадства, абяцала прапагандысцкую падтрымку партыі і камсамолу, выступала за рэалізм у літаратуры, аднак з правам на выкарыстанне мастацкіх дасягненняў «фармальна-мастацкіх напрамкаў». У 1928 годзе рэарганізавана ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў.



**1932 год** — адкрыта першая ў Беларусі пасажырская авіялінія — Мінск—Глуск—Парычы—Мазыр.

### Цытата дня

***«Кахання жанчыны трэба баяцца больш, чым нянавісці мужчыны: гэта — атрута, яна тым больш небяспечная, таму што прыемная».***

**Сакрат (470—399 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.**

## АЎТОРАК

**Аўторак, у супрацьлегласць панядзелку, лічыцца адным са спрыяльных дзён для пачатку разнастайных сямейных і сельскагаспадарчых спраў.**

● Па-першае, аўторак, як і чацвер, — так званыя **«мужчынскія»,** а таму шчаслівыя дні. Па-другое, аўторак нясе ў сваім парадкавым нумары **лічбу два — цотны лік,** што ва ўсходнеславянскай традыцыі заўсёды адпавядала станоўчым якасцям. Між іншым, паўднёвыя і заходнія славяне, наадварот, лічылі аўторак «кепскім», «дрэнным» днём, днём «мерцвякоў».

● Усходнія славяне лічылі аўторак станоўчым днём: распачыналі ворыва або зажынкі; будаўніцтва хаты; саджалі птушку на яйкі. Парны пачатак, закладзены ў сімволіцы назвы гэтага дня, стаў падставай таго, што аўторак лічылі адным з лепшых дзён для сватаўства — ніколі «гарбуза ў рукі» не атрымаеш.

● Аўторак станоўча ўплываў на лячэнне некаторых хвароб. Нават у самой замове ад паслярадавай гарачкі і супраць выкідышаў ёсць зварот да *«святога аўторка»: «Залатнік замаўляю, Божую Мацер прызываю,* **святы аўторак,** *ранняя зара — добрая пара...»* .

● Разам з тым, за аўторкам быў замацаваны цэлы шэраг побытавых і абрадавых абмежаванняў: не пазычаць грошы; не браць шлюб. Лічылася, хто ў гэты дзень ажэніцца, доўгі час разам не пражыве; кароткі век напаткае і дзяцей, народжаных у такіх сем'ях. У аўторак — з-за таго, што **ў назве ёсць літара «р»,** не садзілі гародніны, не білі жывёлу і птушку на мяса, бо лічылі, што зробленае не пойдзе на карысць — паядуць чарвякі.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Дзіўную заканамернасць зусім нечакана адкрыў слесар Сідараў: аказваецца, калі ўвечары не піць гарэлку, дык раніцай галава не баліць.**

☺

Дзве сяброўкі.

— Ты вырашыла на правы здаць?!

— Так.

— А ездзіць хоць вучаць?..

— Вучаць... Плачуць, вучаць і зноў плачуць...

☺

**Калі чалавек смяецца, ён становіцца дабрэйшым, таму просьбу пазычыць грошы трэба пачынаць з анекдота.**

☺

— Ці існуюць таблеткі ад голаду?

— Так, завуцца катлеты!

☺

**На акулавую мову фраза «Чалавек за бортам!» перакладаецца як «Смачна есці!»**

# алімпіец

ЗВЯЗДА

ВЫПУСК № 7 (9)

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь


**”ГЭТА ДАРАГОГА КАШТУЕ, І Я ЎДЗЯЧНЫ ЗА ГЭТА ВЯЛІКАЕ ДЗЕЙСТВА. ГЭТЫ МАТЧ БЫЎ ДЛЯ ТЫХ, КАМУ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА І ПАДТРЫМКА. ДАВАЙЦЕ ЗРОБІМ ТАК, КАБ ТАКІХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ БЫЛО ЯК МАГА БОЛЬШ”**

**”У КАМАНДЫ ВЯЛІКІЯ ПЛАНЫ НА БУДУЧАЕ. А КАБ ЯНЫ ЗБЫВАЛІСЯ, ТРЭБА НАСТОЙЛІВА І ЎПАРТА ІСЦІ НАПЕРАД, НЕ БАЯЦЦА РЫЗЫКАВАЦЬ І НЕ ПАДАЦЬ ДУХАМ, КАЛІ НА ТВАІМ ШЛЯХУ ЗДАРАЮЦЦА НЯЎДАЧЫ І СУСТРАКАЮЦЦА ПЕРАШКОДЫ.”**

# НА ПЕРШЫ-ДЗЯСЯТЫ — РАЗЛІЧЫСЯ!

**Мінскі Палац спорту напярэдадні мінулых выхадных кіпеў ад тэнісных страсцяў. Яшчэ б — у госці да нас заглянулі дзве тэнісныя прымы: 1-я ракетка свету датчанка Каралін Вазняцкі і зорка беларускага жаночага тэнісу, якая ў сусветным рэйтынгу займае высокі 10-ы радок, — Вікторыя Азаранка.**

Яшчэ за некалькі тыдняў да пачатку візіту гэтага зорнага дуэта было вядома, што дзяўчаты правядуць дабрачынны матч, сродкі ад якога пойдуць на патрэбы Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах. Гэта сапраўды быў дабрачынны матч, а не звычайная гульня — для гледачоў, якія прама ці ўскосна сталі мецэнатамі хворых дзяцей. Яшчэ напярэдадні незвычайнага паядынку тытулаваныя спартсменкі наведаліся ў анкалагічны цэнтр, зарадзіўшы пацыентаў энергіяй і надзеяй на лепшае. А потым было сапраўднае шоу, у якім удала перапляліся лідарскія якасці і майстэрства тэнісістак, паказальны майстар-клас для пачаткоўцаў, разняволенасць у адносінах да гледачоў і звычайная кемлівасць для таго, каб завесці публіку. Інакш як можна адзначыць іх паход на трыбуны з мэтай запрасіць стаць апанентам у гульні кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнку. Адметна, што, нягледзячы на «нефармат», Аляксандр Рыгоравіч згадзіўся і выглядаў на тэнісным корце як сапраўдны майстар у вялікім тэнісе.

Зорны тэнісны вечар завяршыўся пад бурныя апладысменты — аукцыёнам, з якога былі прададзены спартыўная форма і амуніцыя спартсменак на карысць дзіцячага цэнтра ў Бараўлянах.

## Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Каралін Вазняцкі і Вікторыі Азаранцы за дапамогу хворым дзецям

**Дабрачынны тэнісны матч мы падарылі дзецям, якія маюць патрэбу ў дапамозе, заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 19 лістапада па выніках выступлення ў мінскім Палацы спорту лідараў сусветнага жаночага тэніса датчанкі Каралін Вазняцкі і беларускі Вікторыі Азаранкі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта было шоу выдатных тэнісістак. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Каралін Вазняцкі і Вікторыі Азаранцы, якія, нягледзячы на шчыльны графік, прынялі ўдзел у гэтым дабрачынным матчы.

«Яны не проста так прыехалі сюды — прыехалі дапамагчы хворым дзецям», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў важнасць таго, што напярэдадні матча знакамітыя тэнісісткі наведалі Рэспубліканскі цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах, дзе правялі паўдня, пагутарылі з дзецьмі і ўсялялі надзею, што тыя паправяцца і будуць жыць. Гэта мацней за любое лякарства.

Прэзідэнт падзякаваў таксама ўсім, хто купіў білеты і прыйшоў на матч лепшых у свеце тэнісістак. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сабраныя сродкі адразу ж будуць накіраваны на лячэнне хворых дзяцей. «Гэта дарагога каштуе, і я ўдзячны за гэта вялікае дзейства. Гэты матч быў для тых, каму патрэбна дапамога і падтрымка. Давайце зробім так, каб такіх мерапрыемстваў было як мага больш», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі ўручыў Вазняцкі і Азаранцы падарункі і кветкі. Ён пажадаў Каралін Вазняцкі як мага даўжэй заставацца першай ракеткай свету і потым перадаць яе беларусцы Вікторыі Азаранцы.

Каралін Вазняцкі ў сваю чаргу падзякавала публіцы і Прэзідэнту за цёплы прыём у Мінску, дзе яна была першы раз. Дацкая спартсменка выказала надзею, што прыедзе ў беларускую сталіцу яшчэ.

Вікторыя Азаранка адзначыла, што вельмі ўдзячна Каралін за яе візіт, і падкрэсліла, што кіраўніцтва краіны вельмі дапамагае спартсменам. Яна таксама сказала, што рада магчымасці аказаць дабрачынную дапамогу хворым дзецям, і паабяцала праводзіць такія дабрачынныя матчы і ў будучым.

На праведзеным матчы вядучыя тэнісісткі планеты не толькі прадэманстравалі сваё майстэрства, але і праявілі сябе як выдатныя арганізатары шоу. Тэнісісткі ў час матча запрасілі на корт Прэзідэнта Беларусі, які знаходзіўся ў ліку гледачоў. Аляксандр Лукашэнка не разгубіўся і ў жартаўлівым мікраматычэ супраць Вікторыі і Каралін паказаў, што і ён даволі нядрэнна гуляе ў тэніс.

Дабрачынны матч паміж першай ракеткай планеты Каралін Вазняцкі і лепшай беларускай тэнісісткай Вікторыяй Азаранка (10-ы нумар сусветнага рэйтынгу) быў праведзены пры перапоўненых трыбунах і завяршыўся перамогай беларускі ў двух сэтах — 6:3, 6:4.

Адразу пасля матча адбыўся дабрачынны аўкцыён, на якім Вікторыя Азаранка і Каралін Вазняцкі выставілі свае гульнявыя ракеткі і спартыўны рыштунак. Сродкі, атрыманыя на аўкцыёне, а таксама ад продажу білетаў на матч, паступяць у Рэспубліканскі цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах.

Кіраўнік дзяржавы пералічыў сваю месячную зарплату на дабрачынны рахунак гэтага анкалагічнага цэнтра.

# ДВАЦЦАТЫ ЗАВЕРШАНЫ!

**Адбыўся апошні тур XX футбольнага чэмпіянату краіны ў вышэйшай лізе. Большасць камандаў яшчэ за некалькі тураў выратавала свае турнірныя задачы, заставалася толькі даць адказ на два апошнія пытанні: хто трэці і хто — дзясяты. Свае праблемы вырашылі клубы «Мінск» і «Нёман».**

У сталіцы на стадыёне «Дынама» «гараджане» перамаглі наваполацкі «Нафтан» і ўпершыню заваявалі бронзавыя медалі, а разам з імі і ўдзел у Лізе Еўропы 2011/2012. На трэцяе месца, як вядома, да апошняга, прэтэндаваў і другі мінскі клуб — «Дынама». Падапечныя Гольмака гулялі ў Жодзіне і прайгралі 1:3.

Вынікі астатніх матчаў: «Нёман»—«Віцебск» — 3:0, БАТЭ—«Шахцёр» — 1:2, «Дынама» (Бр.)—«Белшына» — 2:0, «Партызан»—«Днепр» — 4:3.

Выніковая турнірная табліца: БАТЭ — 72 (ачкі), «Шахцёр» — 66, «Мінск» — 60, «Дынама» (Мн) — 56, «Дынама» (Бр) — 46, «Белшына» — 45, «Нафтан» — 44, «Днепр» — 40, «Віцебск» — 32, «Нёман» — 31, «Тарпеда» (Жодзіна) — 28, «Партызан» — 23.

Чэмпіянат завершаны, але сезон працягваецца. Наперадзе стыкавыя матчы за права гуляць у сезоне-2011 у вышэйшай лізе паміж жодзінскім «Тарпеда» і мінскім клубам СКВІЧ, які сёлета заняў 2-е месца ў першай лізе, а таксама кубкавы паядынак БАТЭ і брэсцкім «Дынама».

# АЛІМПІЙСКАМУ ПРЭС-ЦЭНТРУ — ВЯЛІКАЕ ПЛАВАННЕ ДА ЛОНДАНА

**Гэтымі днямі спартыўная Беларусь яшчэ на адзін крок наблізілася да чарговай летняй алімпіяды — у Нацыянальным алімпійскім камітэце быў урачыста адкрыты «Алімпійскі прэс-цэнтр «Лондан-12».**

Стала ўжо добрай традыцыяй, што НАК Беларусі перад кожнымі Алімпійскімі гульнямі адкрывае алімпійскія прэс-цэнтры. Галоўны — у сталічнай штаб-кватэры, а яшчэ восем — ва ўсіх абласных цэнтрах, Мінску і Бабруйску, дзе функцыянуюць Прадстаўніцтвы НАКа Рэспублікі Беларусь. Балазе, алімпійская тэматыка XXX Гульняў у Лондане для Беларусі ўжо актуальная. Першыя ліцэнзіі на ўдзел у галоўных стартах чатырохгоддзя ўжо заваявалі нашы «зорныя» стралкі Сяргей Мартынаў і Вікторыя Чайка. Трэнер айчынных стралкоў — не менш вядомы Ігар Басінскі.

Шчаслівага плавання ў Лондан беларускім спартсменам пажадалі першы віцэ-прэзідэнт НАКа, памочнік прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіццю турызму Ігар Заічкоў (у цэнтры), міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Алег КАЧАН, віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь Сяргей Цяцерын.

## Кампетэнтна...

**Алег КАЧАН, міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь:**

Сёння падрыхтоўку да Гульняў вядуць 353 беларускія атлеты ў 31 відзе спорту. Усе праграмы падрыхтоўкі распрацаваны, ідзе атэстацыя нацыянальных каманд у Міністэрстве спорту і турызму.

❍

**Беларускімі атлетамі пастаўлена задача заваяваць у Лондане 25 алімпійскіх медалёў, з якіх пяць залатых.**

❍

Беларусь павінна наблізіцца да дзясяткі лепшых алімпійскіх каманд свету. Гэта задача па сілах. Для яе выканання неабходна поўная канцэнтрацыя і аб'яднанне намаганняў усіх бакоў: спартсменаў, трэнераў, чыноўнікаў.

Патэнцыял ёсць. У гэтым годзе на чэмпіянатах свету ў алімпійскіх дысцыплінах беларускімі спартсменамі было заваявана 13 медалёў у сямі відах.

Яшчэ 11 узнагарод было здабыта на кантынентальных першынствах. Але гэтыя лічбы адносныя, таму што топ-турніры праходзілі не ва ўсіх відах спорту.

Леанід ЦУПРЫК, намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама:

# « У нас ёсць дзе развіваць спорт, займацца фізкультурай, праводзіць спаборніцтвы любога ўзроўню»

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

**Сённяшняе наша інтэрв'ю прысвечана тэме стану і перспектыў развіцця спартыўнай галіны, масавага спорту і турызму ў Брэсцкай вобласці.**

***— Леанід Аляксандравіч Як можна ацаніць узровень матэрыяльна-тэхнічнай базы спорту з пазіцыі патрабаванняў сённяшняга дня ў абласным цэнтры, гарадах і раёнах?***

— Для пачатку дазволю сабе некалькі лічбаў і скажу, што ў рамках рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі развіцця фізічнай культуры і спорту, укаранення ў побыт грамадзян здаровага ладу жыцця ў рэгіёнах вобласці дзейнічае 3710 спартыўных збудаванняў, у тым ліку 40 стадыёнаў, 159 футбольных палёў, 386 пляцовак для міні-футбола, 844 спартыўныя залы, 40 плавальных басейнаў, 2 лядовыя палацы і 4 лядовыя арэны, — гаворыць Леанід Аляксандравіч. — Толькі за апошнія два гады на Брэстчыне ўведзены ў эксплуатацыю: лядовая арэна з плавальным басейнам у Бярозе, басейны ў вёсках Мокрае, Клепачы, Навасёлкі, гарадскім пасёлку Ружаны Пружанскага раёна, плавальныя басейны і спартыўныя залы ў Камянцы і вёсцы Камянюкі таго ж раёна. Цудоўную спартыўную базу атрымаў Кобрын: лядовую арэну, стадыён са штучным пакрыццём для заняткаў па хакеі на траве, праведзена поўная рэканструкцыя гарадскога стадыёна, пабудавана вяслярная база. У Баранавічах узведзены Лядовы палац са спартыўнай залай для заняткаў па спартыўнай акрабатыцы і мастацкай гімнастыцы. У Пінску паявілася вяслярная база, а ў Лунінцы праведзена поўная рэканструкцыя гарадскога стадыёна і літаральна праз некалькі тыдняў будзе ўведзена ў эксплуатацыю лядовая арэна. У Маларыце сёлета ўзведзены плавальны басейн са спартыўнай залай, а ў Пружанах летась — Водны палац з элементамі аквапарка. У Брэсце пабудавана картынгавая траса, завершана рэканструкцыя спартыўнай залы для дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы №3 па вуліцы Камсамольскай. Нядаўна здадзены цудоўны палац водных відаў спорту. Як бачыце, спортам і фізкультурай ёсць дзе займацца. А ў бліжэйшыя два гады басейны з'явяцца ва ўсіх райцэнтрах, дзе іх няма: у Ляхавічах, Століне, Івацэвічах, Лунінцы. У Драгічыне і Івацэвічах плануецца ўзвесці лядовыя арэны.

***— Якія спаборніцтвы апошніх года-двух, на Ваш погляд, паспрыялі спартыўнаму аўтарытэту нашай краіны ў далёкім і блізкім замежжы?***

— За азначаны час абласны цэнтр прыняў два афіцыйныя міжнародныя спартыўныя форумы вышэйшага ўзроўню, якія, безумоўна, паўплывалі на аўтарытэт нашай краіны за межамі. Гаворка ідзе пра чэмпіянат Еўропы па акадэмічным веславанні 18-20 верасня 2009 года і чэмпіянат свету па акадэмічным веславанні сярод спартсменаў да 23 гадоў 22-25 ліпеня 2010 года, якія прайшлі на Брэсцкім вяслярным канале. Канал адпавядае ўсім патрабаванням Міжнароднай федэрацыі веславання. Апошняя, дарэчы, адзначыла высокі ўзровень арганізацыі мерапрыемстваў. Напрыклад, на спаборніцтвы гэтага года ў наш горад прыехала 1500 ўдзельнікаў з пяці кантынентаў, якія прадстаўлялі 58 краін, з іх 885 спартсменаў. Такім чынам, сусветная спартыўная супольнасць убачыла, што мы маем аб'екты, якія адпавядаюць міжнародным стандартам і можам праводзіць спаборніцтвы любога ўзроўню.

***— На што можна разлічваць у будучым, маючы на ўвазе спаборніцтвы высокага рангу?***

— Зараз Брэст разглядаецца ў якасці аднаго з прэтэндэнтаў на права правядзення чэмпіянату свету па акадэмічным веславанні ў 2015 годзе. На карысць нашай заяўкі на гэты форум гаворыць каштоўны практычны вопыт, атрыманы за апошнія два гады, а таксама высокая адзнака ўзроўню арганізацыі спаборніцтваў, атрыманая ад прадстаўнікоў Міжнародай федэрацыі акадэмічнага веславання.

29 кастрычніка з удзелам кіраўніка дзяржавы адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця Палаца водных відаў спорту ў Брэсце. Гэта першае ў рэгіёне збудаванне для плавальных відаў спорту такога высокага ўзроўню, адно з лепшых у рэспубліцы і Еўропе. Новы Палац мае чатыры басейны. Самы вялікі з іх, 50 на 25 метраў на восем дарожак, можа быць раздзелены на два 25-метровыя з дапамогай унікальнай аўтаматычнай перасоўнай платформы. Раней вопыту прымянення такіх тэхналогій у Беларусі не было. Басейн для скачкоў глыбінёй 6 метраў абсталяваны трамплінамі вышынёй 1, 3, 5, 7 і 10 метраў. Трыбуна на 1075 пасадачных месцаў адпавядае патрабаванням Міжнароднай федэрацыі плавання для правядзення этапаў Кубкаў свету, чэмпіянатаў свету і Еўропы ў розных узроставых групах.

Не варта забывацца і пра цудоўны спартыўны комплекс «Вікторыя», створаны спецыяльна для развіцця гульнявых відаў спорту. Менавіта «Вікторыя» прымала чэмпіянат Еўропы па самба сярод юнакоў і дзяўчат у маі 2008 года. А зусім нядаўна, 31 кастрычніка напоўненая да адказу зала спартыўнага комплексу «Вікторыя» стала сведкай адборачнага матча чэмпіянату Еўропы-2012 мужчынскіх нацыянальных гандбольных каманд Рэспублікі Беларусь і Расіі.

Варта сказаць, што апошнім часам набываюць вядомасць разнастайныя аматарскія, а таксама моладзевыя спаборніцтвы, у іх ліку можна адзначыць спаборніцтвы юных спартсменаў на прызы газеты «Звязда».

***— Як вырашаюцца ў рэгіёне жыллёва-сацыяльныя праблемы спартсменаў і трэнераў?***

— Як вядома, у Беларусі ажыццяўляецца праграма будаўніцтва жылля для спартсменаў, распрацаваная Нацыянальным алімпійскім камітэтам. На Брэстчыне рэалізацыя гэтай праграмы пачалася ў 2008 годзе. 30 снежня 2008 года ў абласным цэнтры па вуліцы Калесніка здадзены ў эксплуатацыю два жылыя дамы: 72-х і 59-кватэрны. У гэтых дамах пабудавалі кватэры 32 спартсмены, шасцёра з якіх удзельнічалі ў Алімпіядзе ў Пекіне. Навасёламі сталі Юліяна Юшчанка (лёгкая атлетыка), Павел Лыжын (лёгкая атлетыка), Юрый Далгаполаў (кулявая стральба), Ірына Кулеша (цяжкая атлетыка), а таксама 23 трэнеры і 62 працаўнікі спартыўнай галіны.

Сёлета ў чэрвені ключы ад кватэр атрымалі спартсмены Пінска, яны засяліліся ў новы 107-кватэрны дом, а літаральна праз два тыдні наваселлі спраўлялі іх калегі па вуліцы Беларускай у Брэсце. Усяго за час рэалізацыі названай праграмы жыллёвыя ўмовы палепшылі 129 спартсменаў, трэнераў і работнікаў спартыўнай галіны вобласці. На бліжэйшыя гады таксама запланавана ўзвядзенне жылля для спартсменаў.

***— Леанід Аляксандравіч Падчас апошняй паездкі па Брэстчыне Прэзідэнт краіны засяродзіў увагу на неабходнасці рэканструкцыі Брэсцкага аэрапорта. Ці можна разлічваць на значны прыток турыстаў з адкрыццём новых авіялініі і што для гэтага трэба дадаткова?***

— Вядома, з ажыўленнем авіяперавозак стасункі паміж людзьмі будзе ажыццяўляць прасцей. Многія турысты бяруць у разлік і час, затрачаны на падарожжа. Але, на мой погляд, каб новыя авіялініі былі запатрабаваны, неабходна дабівацца адмены візавага рэжыму з краінамі Еўропы альбо значна спрасціць парадак выдачы візаў, напрыклад, зрабіць гэта даступным у пунктах пропуску праз мяжу.

***— На якім узроўні сёння замежны турызм, аграгурызм у вобласці? Якія перспектывы развіцця гэтай галіны?***

— Лічу, што ў цэлым уязны турызм і аграгурызм развіваюцца ў рэгіёне дынамічна. За апошнія гады пабудаваны сучасныя аб'екты: шматфункцыянальны комплекс на вяслярным канале ў Брэсце, санаторна-аздараўляльныя комплексы «Ружанскі» і «Сонечны» ў Пружанскім і Брэсцкім раёнах, сучасныя гасцініцы ў Белавежскай пушчы, сядзіба «Рынькаўка» ў Цюхінічах Брэсцкага раёна, туркомплекс на базе страусінай фермы ў Кобрынскім раёне, аграэкатурыстычны комплекс у вёсцы Клятное Пружанскага раёна, база адпачынку «Без праблем» у Камянецкім раёне, сучасныя комплексы прыдарожнага сэрвісу ў Івацэвіцкім, Баранавіцкім, Пінскім раёнах.

Рэканструяваны палац Бутрымовіча ў Пінску, рэалізуюцца буйныя праекты па ўзнаўленні Агінскага канала і палаца Пуслоўскіх у Івацэвіцкім раёне. Акрамя таго, працягваецца будаўніцтва сучасных турысцка-гасцінічных комплексаў у абласным цэнтры, узводзяцца новыя аб'екты інфраструктуры ўздоўж трасы па перыметры Белавежскай пушчы, вядзецца комплекснае развіццё турыстычнай інфраструктуры і маршрутаў у рэгіёнах Прыпяцкага Палесся. Названае, вядома, спрыяе развіццю турызму ў вобласці.

Штогод у нас праводзяцца цікавыя мерапрыемствы, якія нязменна прыцягваюць гасцей. Напрыклад, аграгурыстычны фестываль «Мотальскія прысмакі», фестываль гумару «Спораўскія жарты», конкурс касцоў на базе заказніка «Спораўскі», аграфестываль «Кузявічы» ў аднайменнай вёсцы Баранавіцкага раёна і іншыя. Варта адзначыць, што аб'ём платных турыстычных паслуг вырас за апошнія тры гады ў 3,6 раза, а экспарт турыстычных паслуг павялічыўся ў 5,7 раза.

У вобласці зарэгістравана 151 вясковая сядзіба і фермерская гаспадарка, якія аказваюць паслугі аграэкатурызму. З 2006 года — часу, калі выйшаў Указ Прэзідэнта РБ № 372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь» — іх колькасць узрасла ў 20 разоў.

***— Ці адпавядае ўзровень работы турфірмаў рэгіёну па прыцягненні замежных турыстаў патрабаванням? Іншымі словамі, ці ўмеем мы рэкламаваць і паказваць свае славутасці?***

— Брэсцкая вобласць вядомая за межамі краіны найперш яе сімваламі — Брэсцкай крэпасцю і Белавежскай пушчай. І мы проста абавязаны рабіць стаўку на турызм. У нас няма буйной прамысловасці. Але ёсць цудоўныя лясы, чыстыя рэкі і азёры, некранутыя балоты Палесся, багатая гістарычная спадчына. А яшчэ ёсць выгаднае геаграфічнае становішча, добрая транспартная інфраструктура.

Але ж калі не працаваць актыўна ў гэтым накірунку, турысты могуць і мінуць нас. Таму нашы турыстычныя арганізацыі пастаянна ўдзельнічаюць у міжнародных выставах у Варшаве, Берліне, Маскве, С.-Пецярбургу. Турыстычныя магчымасці рэгіёну сёлета былі прадстаўлены на дзевяці спецыялізаваных выставах: у Расіі, Польшчы, Украіне, Кітаі.

Апошнім часам стала традыцыйяй арганізоўваць рэкламныя туры для замежных спецыялістаў турыстычнай галіны і журналістаў. Штогод выходзяць у свет больш за 50 каталогаў, буклетаў, картаў на замежных мовах. Зусім хутка пачне працаваць турысцка-інфармацыйны цэнтр у Варшаве, да стварэння якога наш рэгіён мае прамое дачыненне.

Важна, што асобныя турыстычныя фірмы вызначылі прыярытэты. Мы, напрыклад, можам стварыць выдатныя ўмовы для аматараў паляванння, а таксама для тых людзей, што аддаюць перавагу некранутай прыродзе. Адным з запатрабаваных накірункаў стаў так званы «настальгічны» турызм. Ёсць многа людзей у свеце, якія хацелі б наведаць мясціны, дзе жылі іх продкі. Некаторых цікавіць далёкая мінуўшчына. Тэрыторыя сучаснай Брэсцкай вобласці ўваходзіла ў склад розных краін — Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, Савецкага Саюза. У тутэйшых мясцінах адбываліся падзеі, якія мелі міжнароднае значэнне. У 1409 годзе тут быў распрацаваны план бітвы з крыжакамі пад Грунвальдам, у 1553 годзе заснавана першая друкарня на тэрыторыі Беларусі, у 1596-м заключана Брэсцкая унія, у 1918 — Брэсцкі мір, у 1991-м падпісаны дагавор аб спыненні існавання СССР. Месцы, звязаныя з названымі падзеямі, увайшлі ў каталогі турфірмаў.

Вядома, на азначаным накірунку яшчэ многае не дасягнута. І праграма работы ў нас ёсць. Скажам, адным з крокам да паляпшэння якасці турыстычных паслуг можна лічыць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў турыстычных прадпрыемстваў. Цяпер спецыялістаў па турызме ў вобласці рыхтуе тры ВНУ і адзін каледж, а яшчэ пяць гадоў таму такіх спецыяльнасцяў у навучальных установах не было наогул. Вядома, паспрыяюць прытоку турыстаў і будаўніцтва новых гасцініц, іншых аб'ектаў турыстычнага сэрвісу.

Ведай нашых!

Анатоль КАПСКІ:

# «БАТЭ — гэта мой лёс»

Без сумненняў, асоба Анатоля Капскага, як старшыні Праўлення футбольнага клуба БАТЭ, у свядомасці многіх аматараў футболу перастала выклікаць асацыяцыю як толькі спартыўнага боса. Паўтара тыдня таму, падчас наведвання кіраўніком дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам горада Барысава, Анатоль Анатольевіч перад гледачамі, у тым ліку і тэлевізійнымі, выступіў не толькі ў ипастасі кіраўніка футбольнага клуба, але і як генеральны дырэктар вядомага ў нашай краіне прадпрыемства БАТЭ. Праўда, наўрад ці гэтыя абставіны стануць падставай для шматлікіх айчынных аматараў футбола лічыць, што Капскі — футбольны дзеяч напалову.

Ён па-ранейшаму пазіцыянуецца як чалавек футбола. Пацвярджэннем сказанага — мара пабудаваць у Барысаве ўнікальную спартыўную арэну. Яна ўжо стала набываць канкрэтныя абрысы пасля таго, як Прэзідэнт краіны разам з галоўным трэнерам БАТЭ Віктарам Ганчарэнкам заклалі капсулу ў фундамент новага стадыёна, будаўніцтва якога ацэньваецца ў 20 мільёнаў еўра. «Няхай ён стане адным з лепшых месцаў актыўнага адпачынку дарослых і дзяцей, а спаборніцтвы на яго полі будуць нязменна радаваць балельшчыкаў і прынясуць удачу нашым камандам», — гаворыцца ў пасланні.

Пакуль жа футбалісты БАТЭ радуюць сваіх фанатаў і ўсіх сапраўдных беларускіх балельшчыкаў перамогамі не толькі на сваёй гарадской арэне. Датэрміновы выхад у плэй-оф Лігі Еўропы на стадыёне «Дынама», датэрміновае заваяванне залатых медалёў футбольнага першынства ў Бабруйску.

У каманды вялікія планы на будучае, гаворыць Анатоль Капскі. А кабы яны збываліся, зазначае ён, трэба настойліва і ўпарта ісці наперад, не баяцца рызыкаваць і не падаць духам, калі на тваім шляху здараюцца няўдачы і сустракаюцца перашкоды.

**Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам спорту і турызму праводзіць з 16 лістапада па 16 снежня 2010 года Рэспубліканскую спартыўна-моладзевую акцыю «Беларусь — спартыўная краіна».**

**Мэта акцыі — прыцягненне шырокіх слаёў насельніцтва да заняткаў масавай фізічнай культурай і дэманстрацыя дасягненняў у вобласці спорту дзякуючы пастаянным клопатам пра моладзь, што праяўляюць Прэзідэнт і ўрад краіны.**

# Знакамітыя спартсмены сустрэліся з моладдзю

У Баранавічах прайшла Рэспубліканская спартыўна-моладзевая акцыя «Беларусь — спартыўная краіна»

Ястрамбельскую школу-інтэрнат наведалі знакамітыя спартсмены Беларусі. Сустрэчы, спартыўныя мерапрыемствы прайшлі ў гарадскім Доме культуры, Лядовым палацы...

А са студэнтамі Баранавіцкага дзяржуніверсітэта сустрэліся заслужаныя майстры спорту, чэмпіёны і прызёры свету, Еўропы, Алімпійскіх гульняў Леанід Тараненка, Мікалай Алёхін, Наталля Гелах, Юлія Бічык і Яраслава Паўловіч.

Рэктар БарДУ Васіль Качурка, ад імя 10-тысячнага калектыву ўніверсітэта падзякаваў спартсменам і сказаў, што за 6 гадоў існавання ўніверсітэта ў яго сценах упершыню такія высокія госці. А затым выступілі спартсмены і расказалі пра свой шлях у спорце.

*— Каб нечага дасягнуць, неабходна аддаваць сваёй справе ўсяго сябе. Трэба думаць, усё прапускаць праз свае мазгі,* — сказаў Леанід Тараненка — чалавек, які ў цяжкай атлетыцы ўстанавіў 19 сусветных рэкордаў, і некаторыя з іх трымаюцца ўжо 21 год. Яго падтрымаў Мікалай Алёхін — чэмпіён свету, пераможца Алімпійскіх гульняў па фехтаванні на шаблях:

*— Неабходна быць прафесіяналам сваёй справы. Іншым разам нам не хапае мэтанакіраванасці. У кожнага пакалення свае мэты і задачы. Камп'ютар усё не заменіць — неабходна іншым разам і папацець у спартзале.*

Выступленне чэмпіёнкі свету і двухразовага прызёра Алімпійскіх гульняў у акадэмічнай грэблі Наталлі Гелах было кароткім, але шчырым:

*— Сёння ў спартсменаў прыстойная зарплата, і калі ты здольны на дасягненні, то чаму б не атрымаць грошы. Спорт — гэта не толькі свята, але і нялёгкая праца.*

Госці адказвалі на пытанні, і ў аўдыторыі гучалі шчырыя апладысменты. На развітанне спартсменам уручылі сувеніры, а госці падарылі ўніверсітэту спартыўны інвентар. У Лядовым палацы выступалі футбалісты, хакеісты, акрабаты, юныя тэнісісты... Такія сустрэчы нясуць станоўчы зарад. Моладзі цікава паглядзець на знакамітых спартсменаў, паслухаць іх.

# ГОМЕЛЬ НА ДЗЕНЬ СТАЎ АЛІМПІЙСКІМ

Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

Чэмпіён свету па спартыўнай гімнастыцы Дзяніс Савянкоў правёў у Гомелі майстар-клас для выхаванцаў спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 4 у межах акцыі «Беларусь — спартыўная краіна».

Акрамя таго, выхаванцы атрымалі ў падарунак спартыўны інвентар ад НАКа Беларусі. Аналагічныя прэзенты, якія дапамогуць юным спартсменам павышаць сваё майстэрства ў боксе, футболе, хакеі, баскетболе, тэнісе, атрымалі і іншыя дзіцяча-юнацкія школы алімпійскага рэзерву Гомеля, а таксама дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці яслі-сад № 167. Таксама ў Гомелі прайшлі сустрэчы праслаўленых спартсменаў-ураджэнцаў вобласці з моладдзю і семінар па алімпійскай адукацыі. На спартыўных арэнах горада гледачы змаглі ўбачыць бліц-турнір па баскетболе сярод мужчынскіх камандаў студэнтаў мясцовых ВНУ і БДУФК Мінска, рэспубліканскія спаборніцтвы па хакеі з шайбай сярод аматарскіх камандаў на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, дзе сустракаліся каманда Гомельскай вобласці і каманда Прэзідэнта Беларусі. Як адзначыў рэктар беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, старшыня беларускай алімпійскай акадэміі Міхаіл Кобрынскі, тое, што Беларусь — спартыўная краіна — даказваць нашым людзям ужо не трэба:

— Усе бачаць, колькі будуецца спартыўных аб'ектаў. Гэтая акцыя, якую мы праводзім, ідзе па ўсёй краіне. Нядаўна яна адбылася ў Баранавічах. А зараз ўвесь Гомель выйшаў на стадыёны і пляцоўкі, каб не толькі памерацца сіламі са славутымі спартсменамі, але і проста адпачыць, добра правесці дзень, атрымаць зарад бадзёрасці. Усё гэта з'яўляецца залогам здаровага ладу жыцця. Стратэгічны эфект — яшчэ больш моладзі заняць фізічнай культурай і спортам. Каб усе аб'екты, якія будуюцца і пабудаваныя, былі задзейнічаны максімальна, і ў іх займаліся і дзеці, і дарослыя.

**Матэрыялы падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Пётр РАБУХІН, Святлана ЯСКЕВІЧ, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.